№ 8(38)/2001

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, 1–15 верасьня 2001 г.



## „ВЫБРАЛІ...”

Амаль тыдзень доўжыўся бессаромны спэктакль пад назвай „галасаваньне за прэзыдэнта”. Скарыстаўшы палажэньне Закона аб магчымасьці папярэдняга галасаваньня для тых, хто ў дзень выбараў ня можа знаходзіцца па месцы жыхарства, улады рэжыму па загаду зьверху на працягу 5-ці дзён арганізоўвалі масавы і прымусовы прывоз („прыгон”) выбаршчыкаў на выбарчыя ўчасткі для галасаваньня, з намаўленьнем галасаваць за Лукашэнку. Адначасна аб’язджалі хаты і вёскі са скрынямі для галасаваньня.

Кантраляваць такія „выбары” не далі магчымасьці (ды й вельмі цяжка). Скрыні на ноч заставаліся, як правіла, у кабінэтах мясцовых начальнікаў, альбо ў выбарчых камісіях. Кантралёры за галасаваньнем ня ведалі і не маглі ведаць, што адбываецца са скрынямі па начах.

У выніку ў некаторых раёнах пачалося „сацспаборніцтва” рэжымнай намэнклятуры за высокія паказчыкі папярэдняга галасаваньня. Дзе-ні-дзе паказчыкі дасягнулі 50-55 адсоткаў папярэдне прагаласаваных. (Некаторым п’яніцам давалі нават выпіць гарэлкі, каб прагаласаваў, „як трэба”.)

Калі 9-га верасьня пачалося нармальнае галасаваньне, то выбары былі ўжо папярэдне зроблены на карысьць Лукашэнкі. Тым ня менш ў гэты

дзень фальсіфікацыі прадаўжаліся ў шырокім маштабе. На шмат якіх участках назіральнікаў увогуле не дапусьцілі да назіраньня. А тым, каго дапусьцілі, дазволілі назіраць толькі з адлегласьці 10 мэтраў, пры гэтым яны не павінны былі рухацца і ўставаць зь месца. Назіраць за падлікам галасоў кантралёраў не дапусьцілі.

Нават у гэтакіх умовах назіральнікі заўважылі мноства грубых парушэньняў, склалі сотні пратаколаў.

У Наваполацку назіральнікі зрабілі засаду на выбарчую камісію і злавілі іх у той момант, калі яны выносілі скрыню для галасаваньня, каб замяніць на іншую. У Гомельскай вобласьці „сацспаборніцтва" выбарчых камісіяў і „вертыкалі" дало рэкордны адсотак галасоў за Лукашэнку: ад 90 да 95 адсоткаў. Прытым, на некаторых участках, як



(Фота В.Драчова, „Кур'ер")

***Як выбралі, так і жывём.***

заўважылі назіральнікі, бюлетэняў увогуле не лічылі і запісалі стопрацэнтовую колькасьць прагаласаваных. Гэтакага не было нават за саветамі. (Там спыняліся на 99,99 адсотку.)

У выбарчыя камісіі не былі ўключаныя назіральнікі ад партыяў і палітычных арганізацыяў. У камісіях сабралі выключна адну пралукашэнкавую прамаскоўскую масьць. Так што лічылі, як хацелі, і рабілі таксама, што хацелі.

У дзень выбараў была зроблена беспрэцэдэнтная дыверсія ўладаў. Поўнасьцю адключылі сувязь (тэлефоны, факсы, мабільныя тэлефоны, інтэрнэт, электронную пошту) у офісах партыяў, беларускіх і „дэмакратычных" арганізацыяў, выбарчых штабах, карпунктах рэдакцыяў газэтаў і радыё. Краіна беларусаў асьлепла і аглохла на цэлы дзень. Дзейнічала толькі сувязь у афіцыйных уладаў і ў выбарчых камісіях.

Гэты факт наглядна паказаў на ўзровень акупацыйнага кантролю КГБ над нашай краінай.

Ужо вечарам Лукашэнка з кампаніяй сьвяткавалі „чэсны" „выбар народу". За Лукашэнку, аказваецца, прагаласавала 75,6 адсотка выбаршчыкаў.

Прадстаўнікі АБСЭ гаварылі блытаныя супярэчлівыя фразы пра „недэмакратычныя выбары" і... пра шкоду ізаляцыі рэжыму ў Беларусі. Але назаўтра, 10-га верасьня, Злучаныя Штаты Амэрыкі і краіны Эўрапейскага Зьвязу выразна выказаліся аб непрызнаньні прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі за справядлівыя.

Апазыцыйная намэнклятура і калябаруючыя зь ёй „дэмакраты" ды некаторыя былыя фронтаўцы выглядалі нікчэмна і разгублена. „Несмотря ни на что, это победа демократии, потому что все мы объединились", * — сказаў „адзіны" намэнклятурны кандыдат **У. Ганчарык**. „Ура-а-а-а", — пачулася ў адказ сярод дэмакратаў на мітынгу дэмакратыі на Цэнтральнай плошчы ў Менску. (Сабралася каля тысячы чалавек.)

— У іх нешта не ў парадку з галавой, — сказаў мне адзін назіральнік выбарчага спэктаклю ў Беларусі. — Якая тут „победа демократии"?

Вялікі стратэг **Ганс Вік** сплянаваў усё, як у Нямеччыне: 14 тысячаў незалежных назіральнікаў павінны былі зрабіць паралельны падлік галасоў, каб выявіць фальсіфікацыю. Выбралі 500 выбарчых участкаў для паралельнага лічэньня. Згодна „стратэга", прадстаўнікі назіральнікаў павінны былі пазнаёміцца на месцы з пратаколамі камісіяў і параўнаць з сваімі практыкаваньнямі. Але рэжым у Беларусі — гэта не Нямеччына. Тры тысячы падрыхтаваных назіральнікаў улады ўвогуле не зацьвердзілі і не акрэдытавалі. Астатніх — у сто камісіяў не дапусьцілі да назіраньня, іншым — адмовіліся паказваць пратаколы і якія-небудзь дакуманты. Акрамя таго, як я ўжо пісаў, — адключылі ўсялякую сувязь.

Нямецкая „стратэгія" тут жа развалілася. Аказваецца, намэнклятурная „апазыцыя" была абсалютна непадрыхтаваная да такога павароту справаў.

(Нядаўна ў Беларусі выйшла на расейскай мове арыгінальная кніжка *Яўгена Будзінаса „Дураки".*)

Пасьля паўночы лідары і дарадцы апазыцыі намэнклятурных „дэмакратаў"забарыкадаваліся ў Палацы культуры савецкіх прафсаюзаў і задумаліся, што рабіць далей. „Цэнтр супраціўленьня рэжыму" ахоўвала некалькі дзясяткаў маладых хлапцоў. Але калі яны зажадалі, як і належыцца, вывесіць над „цэнтрам супраціўленьня" беларускі *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*, то лідары „апазыцыі" тут жа зашыкалі, замахалі рукамі і — забаранілі. (Маўляў, каб пазьбегнуць правакацыі.)

„Дыскусіі былі малавынiковымі, — піша, пацяшаючыся, *„Gazeta Wyborcza".*

— А можа, надрукаваць нам крыху лістовак? Гэтакіх невялічкіх.., — прапанаваў ў канцы камуніст **С.Калякін**... Але аказалася, аднак, што няма нават паперы на лістоўкі." *(„Gazeta Wyborcza", — 2001.11.09)*

Пра ўзровень савецкай каляніяльнай намэнклятуры на Беларусі найлепш сьведчаць так званыя „царскія вёскі" вакол беларускіх гарадоў. У пачатку 90-х гадоў, выклікаўшы штучную гіперінфляцыю, камуністычная намэнклятура, маючы ўладу, прыгарнула да рук усе ашчадныя зьберажэньні беларусаў, што ляжалі ў дзяржаўным банку. Абрабавалі ўсю нацыю.

Але як жа распарадзіліся прыўлашчанымі грашыма народа савецкія начальнікі, што баяліся эканамічных рэформаў і стаялі за калгасы? Яны ня ўклалі іх ні ў бізнэс (у якім не разьбіраліся), ні ў вытворчасьць. Пачалі масава будаваць „катэджы" вакол гарадоў. Катэджы аказаліся нерэнтабельнымі і дарагімі ў эксплуатацыі палацамі-даўгабудамі, жыць у якіх было б вельмі дорага. (Дабудаваўшы пад дах, яны раптам зразумелі, колькі будзе каштаваць эксплуатацыя такога хорама і жыцьцё ў хораме, разам з пракладкай кабеляў, праводкай вады, каналізацыі, цеплатрасы, электрычнасьці і г.д.)

Так і засталіся „царскія вёскі" недабудаванымі да канца, як помнік намэнклятурнай абмежаванасьці і нацыянальнага марнатраўства (ці па-

просту — ідыятызму). „Законна ўкрадзеныя" народныя грошы пертварылі ў груду цэглы мёртвых дамоў.

Цяпер гэтых „арыгіналаў" адкапаў Вік з Масквой у якасьці „дэмакратычнай апазыцыі", пасьля таго, як аслабілі і адціснулі ўбок *Беларускі Народны Фронт*.

Савецкая намэнклятура зноў сыграла сваю дрэнную „гістарычную" ролю: дапамагла Лукашэнку (сваёй нікчэмнасьцю) дэманстратыўна сфальшаваць выбары і застацца пры ўладзе, няхай сабе і нелегальнай і не прызнанай. Гэтай яго ўлады Маскве можа стаць дастаткова, каб паступова поўнасьцю захапіць Беларусь.

***Адам МІКША***

* Нягледзячы ні на што, гэта перамога дэмакратыі, таму што ўсе мы аб'ядналіся. (з рус.)

# ВЫБРАНЫЯ ФАКТЫ

*26 жніўня* сёлета ў Віцебску сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Раман Салаўян*** і *Маладога Фронту* ***Андрусь Капорыкаў*** адзначылі ўгодкі наданьня Дэклярацыі аб незалежнасьці Беларусі статусу канстытуцыйнага акту. Яны прайшлі пад *Бел-Чырвона-Белым Сьцягам* больш за 7 кілёмэтраў ад вёскі Зайцава да цэнтру Віцебску, дзе на плошчы Леніна іх затрымала міліцыя. Быў складзены пратакол.

*27 жніўня* ў цэнтры Віцебску, як і ў папярэднія дні, праводзіў передвыбарчы пікет сябра *Сойму Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімер Плешчанка***. Ён трымаў плякат з заклікам ісьці на выбары і прагаласаваць супраць усіх кандыдатаў. Раптам на яго накінуліся чацьвёра маладых лейтэнантаў міліцыі і пачалі пагражаць, патрабавалі сысьці ды парвалі плякат. Выклікалі групу АМАПу, якая завезла спадара *Плешчанку* ў пастарунак, дзе быў складзены пратакол „за правядзеньне несанкцыянаванага пікету". Аказалася, што маладыя афіцэры міліцыі толькі што скончылі магілёўскую школу міліцыі, яшчэ не прызначаныя на месца службы. А як імпэтна кідаюцца на людзей, што трымаюць плякаты на беларускай мове!

Антызаконныя дзеяньні міліцыі сьведчаць пра тое, каго і якіх лёзунгаў баіцца рэжым Лукашэнкі, гатовы да фальсіфікацыі выбараў.

*2 верасьня* сёлета ў Баранавічах быў зроблены напад на спадара ***Яўгена Даўгіловіча***, сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*. Спадар *Даўгіловіч* у цэнтры горада раздаваў передвыбарчыя ўлёткі і трымаў плякат ***„Беларусы, вас зацягваюць у маскоўскую пастку. Галасуйце супраць усіх і толькі 9 верасьня!"*** На яго накінуліся людзі ў цывільным, зацягнулі ў машыну і завезьлі ў гарадзкі РАУС. Аказалася, што гэта былі работнікі міліцыі (якія дзейнічалі, як бандыты). Допыт праводзіў старэйшы лейтэнант **Кандратчык**. Спадара *Даўгіловіча* прымусілі напісаць тлумачальную запіску, а на ягоныя аргументы, што ідзе передвыбарчая кампанія і ён дзейнічае ў рамках закону, міліцыянты адказалі, што ***міністар Навумаў загадаў затрымліваць усіх, хто заклікае галасаваць супраць усіх кандыдатаў***. Потым міліцыянты завялі спадара *Даўгіловіча* ў будынак КГБ, дзе зь ім правялі размову.

*2 верасьня* спадарыня ***Сьвятлана Захарэвіч***, сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, распаўсюджвала передвыбарчыя інфармацыйныя матэрыялы на праспэкце Пушкіна ў Менску. Агітатары з лукашэнкаўскага штабу паклікалі людзей у вайсковай уніформе (!), якія спрабавалі затрымаць пажылую жанчыну і зьвесьці яе з гэтага люднага месца. Але яна не падпарадкавалася ім і працягвала раздаваць матэрыялы. Потым прыйшлі міліцыянты, груба дапытваліся, адкуль у яе ўлёткі, спрабавалі затрымаць.

Нэрвовая рэакцыя лукашэнкаўскіх органаў МУС і КГБ сьведчыць аб тым, каго і якой пазыцыі ды передвыбарчых лёзунгаў асьцерагаецца рэжым.

<u>Сябры *Партыі БНФ*, якія былі незаконна затрыманыя міліцыяй за ўдзел у передвыбарчай агітацыі:</u>

***Уладзімер Плешчанка***, ***Раман Салаўян***, ***Барыс Хамайда***, ***Юры Санько***, ***Сьвятлана Захарэвіч***, ***Яўген Даўгіловіч***, ***Алег Сагадзін***, ***Мікалай Анцыповіч***, ***Алег Борын***.

<u>За ўдзел у передвыбарчай агітацыі былі выкліканыя ў КГБ:</u>
***Алесь Чахольскі, Аляксей Фралоў, Яўген Даўгіловіч.***

*(Інфармацыйная камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ. В. БУЙВАЛ)*

# ПЕРАМЕНЫ БЕЗ ПЕРАМЕНЫ

Выбары прэзыдэнта на Беларусі сфальшавалі адкрыта, груба і дэманстратыўна. Гэта была тыповая прафанацыя выбараў, якія звычайна робяць на акупаваных тэрыторыях.

Прамаскоўскі рэжым на Беларусі прадаўжаецца. Краіны заходняй дэмакратыі заявілі, што прызнаць гэтыя выбары нельга. Фальсіфікацыя мела маштабы адкрытага злачынства супраць беларусаў.

Выбары без палітычнай альтэрнатывы яшчэ не гарантуюць перамогу дыктатару, але аблягчаюць фальсіфікацыю. Маючы невыразных апанэнтаў, Лукашэнка мог не баяцца „народнага ўздыму", нават калі б выкрыўся ўвесь падлог (а ён выкрыўся). Масы ня пойдуць за мастадонтамі старой савецка-камуністычнай намэнклятуры, зь якімі змагаліся, ад якіх цярпелі.

Ніхто не забыўся, што нядаўна яны вадзілі народ да камунізму. У іх няма ніякіх ідэяў, і самае галоўнае: у іх ніколі не было і няма цяпер — беларускай нацыянальнай ідэі. Гэта людзі з савецкай каляніяльнай псіхалёгіяй.

Нямецка-расейскія „дыпляматы-тэхнолягі", што ціха працавалі супраць *Народнага Фронту* і дапамагалі вяртаньню кебічаўскай намэнклятуры ў актыўную палітыку, не маглі гэтага ня ведаць і не разумець.

У выніку Лукашэнка без напружаньня, скарыстаўшы выбары, ажыцьцявіў чарговы захоп улады на наступныя пяць гадоў.

* * *

Як жа магло такое атрымацца, што, пад выглядам апазыцыі, на Беларусі адбылося вяртаньне ў палітыку кебічаўскіх намэнклятурных бурбонаў?

Спачатку палітычны канфлікт выглядаў проста: з аднаго боку, прамаскоўскі рэжым, з другога — *Беларускі Народны Фронт* і часткова — розныя агульна дэмакратычныя паўкаляніяльныя партыі. Але неўзабаве ў кіруючым асяроддзі рэжыму стварылася ўнутраная апазыцыя са старой і новай прамаскоўскай намэнклятуры. Прычына апазыцыйнай незадаволенасьці прадстаўнікоў выканаўчай улады — аўтарытарны стыль кіраўніцтва, самаупэўненая некампетэнтнасьць і паталягічныя рысы характару Лукашэнкі. Для іх галоўнае — павінен быў быць іншы „начальнік", больш ляяльны, больш разумны, лепш выхаваны, спакойны і „дэмакратычны" (гэта значыць, каб паважаў і раіўся з намэнклятурай). Астатняе мала істотна.

Арбітрам у гэтым супроцьстаяньні ўнутраная апазыцыя, па старой савецкай звычцы, выбрала Маскву, усяляк стараючыся схіліць Крэмль на свой бок.

Будучы слабой, апазыцыйная намэнклятура пачала шукаць апоры ў агульных дэмакратаў і ў так званым „незалежным друку". Тыя прынялі яе з раскрытымі абдымкамі. У выніку стварылася вельмі зручная для Масквы „апазыцыя". (Асабліва ўлічваючы інфільтрацыю „дэмакратаў" спэцслужбамі і значны кантроль спэцслужбаў над „незалежным друкам".) Масква, згодна сваёй канцэпцыі, атрымала грунт для „кіруемага канфлікту", калі абодва бакі — кіраўніцтва рэжыму і „апазыцыя" да яго — аднолькава кантралююцца Масквой. У гэтакім стане прышлі да „выбараў" прэзыдэнта.

* * *

Такое стала магчымым толькі пасьля таго, як быў аслаблены *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"*.

Барацьба расейскай улады зь беларускім нацыянальна-вызвольным рухам мае стагадовую гісторыю. У 30-х — 40-х гадах мінулага стагоддзя ён быў поўнасьцю разгромлены НКВД і польскай „дэфэнзывай". Рэшткі яго змагароў выжылі толькі ў эміграцыі. У 80-х гадах беларускі вызвольны рух адрадзіўся. У 1990 годзе частка ягоных дзеячоў трапіла ў Вярхоўны Савет і стварыла невялікую, але вельмі баявую і эфэктыўную дэпутацкую *Апазыцыю Народнага Фронту.* Дзейнічаючы рашуча і зладжана з усім *Фронтам*, у 1991 г. яна дамаглася канстытуцыйным шляхам незалежнасьці Беларусі, спыненьня дзейнасьці КПСС і ЛКСМ на тэрыторыі краіны.

Гэта сталася поўнай нечаканасьцю для савецкага КГБ і гэбоўскіх палітыкаў Расеі. Яны пачалі сур'ёзную і асэнсаваную вайну супраць беларускага адраджэньня.

Пералом пачаўся ў 1994 годзе, калі на прэзыдэнцкі пасад прывялі А.Лукашэнку. Аднак антыбеларуская палітыка стаўленьніка не аслабіла *Народны Фронт.* У 1996 г. ён ператвараецца ў даволі шырокі беларускі рух, які, нягледзячы на рэпрэсіі, затармазіў анэксійную „інтэграцыю" і ў сярэдзіне 1997 г. *(на V-м Зьезьдзе БНФ)* аб'явіў пра неабходнасьць гуртаваньня ўсіх змагарных сілаў у *Беларускі Вызвольны Рух*.

На зьнішчэньне гэтай нацыянальнай беларускай салідарнасьці і пэрспэктывы Масква кінула вялікія сілы і сродкі. Але разбуральны вынік быў дасягнуты толькі з прыездам на Беларусь **Ганса Георга Віка** ў якасьці кіраўніка Місіі АБСЭ ў Менску.

Злучэньне расейскіх інтарэсаў зь нямецкімі, плюс дэмакратычная дэмагогія і матэрыяльныя сродкі ў барацьбе зь беларускім нацыянальным адраджэньнем зрабілі сваю чорную справу ўжо ў 1999 годзе, калі, пасьля шэрагу антыфронтаўскіх авантураў („праект Чыгір" і інш.), Фронт падзяліўся і частка яго далучылася да інсьпіраванай Вікам так званай „аб'яднанай дэмакратычнай апазыцыі". „Нацыянальная ідэя вычарпала сябе", — было заяўлена адным з раскольных фронтаўцаў. Пачаўся дрэйф адлучэнцаў у „дэмапазыцыю" без нацыянальнай ідэі, які закончыўся прыплыцьцём да кебічаўскай намэнклятуры. Да тых, супроць якіх (не на жыцьцё, а на сьмерць) змагаўся *Фронт*, каб вырваць незалежнасьць і дзяржаву зь іхных прамаскоўскіх камуністычных лапаў.

Традыцыйны *Фронт* і *Партыя Фронту*, што засталіся на адраджэнскіх пазыцыях, ня здолелі (чаго раней ніколі не было) сабраць неабходны запас подпісаў, каб прымусіць рэжым зарэгістраваць беларускага кандыдата на прэзыдэнта Беларусі. 104600 подпісаў дастаткова для рэгістрацыі па закону, але замала для змаганьня з рэжымам. І антызаконны рэжым гэта спакойна прадэманстраваў.

* * *

Выбары 9-га верасьня засьведчылі фальсіфікацыю галасаваньня і захоп улады Лукашэнкам. Разам з тым, яны засьведчылі аслабленьне беларускіх нацыянальна-вызвольных сілаў, якія не змаглі актыўна ўдзельнічаць у выбарах і рэальна паўплываць на іхны ход.

Вядома, што дзьве трэці беларусаў супраць дыктатуры існуючай асобы, але ў выбарчай кампаніі вырашыла сіла ўлады і ашуканства, памножаная на пасіўнасьць грамадзтва.

„Трэцяя дыктатура" (гэта, фактычна, ужо трэці тэрмін Лукашэнкі) ня можа быць моцнай. У новых нестабільных умовах беларускі нацыянальна-вызвольны рух павінен вельмі дакладна прадумаць сваю рэальную палітыку і адэкватнасьць дзеяньняў, каб пераламаць заганную дэградацыю адносінаў і ўпадак грамадзтва.

***Сфальшаваныя выбары нельга прызнаваць. Лукашэнка ня ёсьць легальна выбраны кіраўнік. Ня можна прызнаваць легітымнасьць яго ўлады.***

Непрызнаньне сфальшаваных выбараў ставіць перад беларускім грамадзтвам задачу дамагацца ануляваньня іхных вынікаў і правядзеньня новых выбараў пад кантролем і пратэктаратам міжнародных арганізацыяў.

***Мар'ян ВАНЬКЕВІЧ***

# ПЭТЫЦЫЯ Ў АРГАНІЗАЦЫЮ ПА БЯСЬПЕЦЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВЕ Ў ЭЎРОПЕ

*7 верасьня 20 сяброў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ сабраліся каля сядзібы КНГ АБСЭ ў Менску. Яны трымалі плякаты на беларускай і ангельскай мовах: „Патрабуем ад АБСЭ не прызнаваць гвалтоўныя выбары". Супрацоўнікам АБСЭ перадалі пэтыцыю.*

* * *

Заключны этап выбарчай прэзыдэнцкай кампаніі ў Беларусі сьведчыць аб тым, што рэжым Лукашэнкі, так жа сама, як і на працягу ўсіх гадоў свайго існаваньня і на ўсіх этапах передвыбарчай кампаніі, не зьмяніў свайго антыдэмакратычнага характару. ***Рэжым брутальна і сістэматычна парушае сваё ўласнае заканадаўства і рыхтуе маштабныя фальсіфікацыі вынікаў выбараў, чарговы падман беларускага народу і міжнароднай грамадзкасьці.***

Аб гэтым сьведчаць шматлікія факты і ўся выбарчая тактыка рэжыму. У Цэнтральную і мясцовыя выбарчыя камісіі не былі дапушчаны прадстаўнікі палітычных партыяў. Зборшчыкі подпісаў за альтэрнатыўных кандыдатаў пацярпелі ад нападаў і арыштаў з боку прадстаўнікоў улады. Сродкі масавай інфармацыі знаходзяцца пад поўным кантролем рэжыму і працуюць на прапаганду адзінага кандыдата — Лукашэнкі. Рэдакцыі і выдавецтвы незалежнай прэсы церпяць ад паліцэйскіх рэпрэсіяў. На ўсіх этапах передвыбарчай барацьбы альтэрнатыўных Лукашэнку кандыдатаў і апазыцыйныя сілы ў цэлым шальмавалі, на іх паклёпнічалі, ачарнялі. Рэжым не зацікаўлены ў тым, каб стварыць атмасфэру роўнай канкурэнцыі, адкрытага дыялёгу. Наадварот, на апошнім этапе кампанія на карысьць Лукашэнкі набыла пачварныя формы гёбельсаўскай прапаганды. Дзяржаўныя, народныя грошы кінутыя на правядзеньне манумэнтальных прапагандысцкіх шоў: „усенародных сходаў выбаршчыкаў". На падтрымку Лукашэнкі мабілізаваныя намэнклятура ўсіх узроўняў, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстановаў, якія ў якасьці аргумантаў шырока выкарыстоўваюць пагрозы ў адрас сваіх падначаленых і мэтады эканамічнага ўціску. З чацьвёртага верасьня, калі пачалося „папярэдняе галасаваньне", парушэньне заканадаўства набыло непараўнальныя формы і размах. Па ўсіх грамадзкіх структурах уладамі рэжыму дадзены загад арганізаваць папярэдняе галасаваньне ня менш як 30% выбаршчыкаў. Тое, што прадугледжана законам як выключны момант (на выпадак немагчымасьці выбаршчыку прагаласаваць у дзень галасаваньня 9 верасьня), рэжым трактуе як інструмант фальсіфікацыі вынікаў галасаваньня і гвалту над электаратам. З розных куткоў Беларусі паступаюць зьвесткі пра тое, што адміністрацыя прадпрыемстваў і ўстановаў, камандаваньне вайсковых і міліцэйскіх частак арганізоўваюць масавае папярэдняе галасаваньне падначаленых асобаў у службовы час. На шэрагу прадпрыемстваў былі нават скарочаныя працоўныя зьмены. Людзей саджаюць у службовыя аўтобусы і вязуць на выбарчыя ўчасткі.

Мы назіраем зьяву прымусовага галасаваньня.

Актывізавалася рэпрэсіўная дзейнасьць рэжыму супраць актывістаў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, якія выкарыстоўваюць сваё права на передвыбарчую агітацыю. Пікеты нашай Партыі, якія дзейнічаюць пад законным лёзунгам ***„Ідзіце на выбары і выкрэсьлівайце ўсіх! Патрэбныя новыя выбары!"*** разганяе міліцыя, агітатараў затрымліваюць, на іх складаюць пратаколы. Дзясяткі такіх інцыдэнтаў адбылося ў апошнія дні па ўсёй краіне.

Расейскія палітыкі адкрыта выступілі на баку Лукашэнкі. Нядаўнія візіты і выступы А.Тулеева, Ю.Лужкова ды іншых уяўляюць сабой бессаромнае ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы краіны.

Рэжым чыніць перашкоды незалежнаму назіраньню за выбарамі. У шэрагу выбарчых камісіяў кіраўніцтва камісіяў адмовілася прызнаваць

незалежных назіральнікаў, якія прадставілі адпаведныя дакументы ад сваіх арганізацыяў, і выдалілі назіральнікаў з тэрыторыі выбарчых участкаў.

Усе гэтыя факты сьведчаць пра сістэматычнае парушэньне рэжымам дзейнага заканадаўства і міжнародных дэмакратычных нормаў. Рэжым Лукашэнкі пераўтварыў выбары ў выбарчае шоў, якое ня мае дачыненьня да законаў і нормаў. Вынікі такіх „выбараў" ня могуць быць прызнаныя беларускім грамадзтвам і міжнароднай супольнасьцю.

Мы патрабуем ад АБСЭ не прызнаваць вынікі гвалтоўных выбараў 9 верасьня 2001 года ў Беларусі.

*Кіраўніцтва Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*

*7 верасьня 2001 г.*

# ВЫБАРЧЫ ФАРС

Увесь ход выбарчай кампаніі і заключны яе этап прадэманстравалі грамадзтву і ўсяму сьвету, што рэжым Лукашэнкі працягвае сваю антыдэмакратычную палітыку і не зьбіраецца арыентаваць нашу краіну на шлях дэмакратыі. Парушэньні заканадаўства рэжымам Лукашэнкі мелі такія непараўнальныя маштабы і цынічныя формы, што прэзыдэнцкія выбары 2001 году сталі чарговай антызаконнай акцыяй уладаў.

У склад Цэнтральнай і тэрытарыяльных выбарчых камісіяў ня былі ўключаныя прадстаўнікі палітычных партыяў. Многія тэрытарыяльныя камісіі былі складзеныя з прадстаўнікоў аднаго прадпрыемства або ўстановы. У склад кожнай тэрытарыяльнай камісіі быў уведзены прадстаўнік выканаўчай улады („вертыкалі"), які кіраваў дзейнасьцю камісіі і кантраляваў яе. На этапе збору подпісаў за прэтэндэнтаў у кандыдаты на прэзыдэнцтва зборшчыкі подпісаў ад *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* падвяргаліся нападам і арыштам з боку прадстаўнікоў улады. Сродкі масавай інфармацыі знаходзіліся пад поўным кантролем рэжыму і працавалі на прапаганду аднаго кандыдата Лукашэнкі. Рэдакцыі і выдавецтвы незалежнай прэсы падвяргаліся паліцэйскім рэпрэсіям. На ўсіх этапах перадвыбарчай барацьбы рэжым шальмаваў, паклёпнічаў і ачарняў альтэрнатыўных Лукашэнку кандыдатаў і апазыцыйныя сілы ў цэлым.

На заключным этапе дзеяньні рэжыму можна кваліфікаваць як сістэматычнае злачынства ў маштабах усяе краіны. Рэжым адкінуў нават зьнешнія формы законнасьці. Адзін з актаў гэтага злачынства — „папярэдняе галасаваньне", арганізаванае 4-8 верасьня. Тое, што прадугледжана законам як выключны момант (на выпадак немагчымасьці выбаршчыку прагаласаваць у дзень галасаваньня), улады выкарысталі як інструмант фальсіфікацыі вынікаў галасаваньня і гвалту над электаратам. З усіх куткоў Беларусі паступілі зьвесткі пра тое, што адміністрацыя прадпрыемстваў і ўстановаў (перш за ўсё, навучальных установаў), камандаваньне вайсковых і міліцэйскіх частак арганізоўвалі масавае папярэдняе галасаваньне падначаленых асобаў у службовы час. Людзей саджалі ў аўтобусы і прымусова везьлі на выбарчыя ўчасткі. Нават паводле зьвестак уладаў, у папярэднім галасаваньні прынялі ўдзел да **15%** выбаршчыкаў. А з некаторых рэгіёнаў нашыя назіральнікі падаюць лічбу да **60%** удзелу ў папярэднім галасаваньні. Гэта было прымусовае галасаваньне, якое яшчэ да выбараў дало магчымасьць уладам Лукашэнкі сфальсіфікаваць галасаваньне ў сваю карысьць. Лёс выбараў быў вырашаны такім чынам яшчэ перад выбарамі.

На многія выбарчыя ўчасткі назіральнікі ад *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ня былі дапушчаныя або гвалтоўна выдаляліся, калі пачыналі сваю працу. ***Ніводзін з назіральнікаў*** ад нашай Партыі ня быў дапушчаны да назіраньня ў раённых выбарчых камісіях падчас падліку дадзеных з участковых выбарчых камісіяў; назіральнікаў не дапусьцілі таксама на выніковае паседжаньне гарадзкіх выбарчых камісіяў, дзе падводзіліся папярэднія вынікі галасаваньня. ***На ўсіх выбарчых участках*** назіральнікі ня былі дапушчаныя да месцаў, дзе ішоў падлік бюлетэняў і галасоў, бліжэй, чым на 6-10 мэтраў. Былі прымененыя спосабы падліку галасоў, якія не дазволілі назіральнікам праводзіць кантроль. Такім чынам ***улады не дазволілі кантраляваць вынікі галасаваньня***.

Палітычнае кіраўніцтва Расеі ўсіх узроўняў і амаль усе сродкі масавай інфармацыі (тэлебачаньне, радыё, прэса) адкрыта выступілі ў падтрымку Лукашэнкі, што ёсьць антызаконным умяшальніцтвам ва ўнутраныя справы Беларусі.

Усе гэтыя факты сьведчаць пра сістэматычнае, у маштабах усёй краіны парушэньне рэжымам Лукашэнкі дзейнага заканадаўства і міжнародных дэмакратычных нормаў. Вынікі такіх „выбараў" ня могуць быць прызнаныя беларускім грамадзтвам і міжнароднай супольнасьцю.

*Кіраўніцтва Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*
*і Беларускага Нарлоднага Фронту „Адраджэньне"*

*10 верасьня 2001 г.*

# ПРА ПАРУШЭНЬНІ ЗАКОНУ ПАДЧАС ПРЭЗЫДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ У БЕЛАРУСІ

*Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ (Партыя БНФ)* прынялі актыўны ўдзел у правядзеньні назіраньня за галасаваньнем падчас выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь *4-9 верасьня 2001 г.* Сойм *Партыі БНФ* на сваім паседжаньні 11 жніўня 2001 г. вылучыў 1100 назіральнікаў, якія праводзілі назіраньне ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Падчас назіраньня былі выяўленыя шматлікія грубыя парушэньні ў арганізацыі выбараў, працэдуры галасаваньня, падліку галасоў, афармленьні дакумантаў, галоснасьці і празрыстасьці выбарчага працэсу. Назіральнікі выявілі наступныя парушэньні:

1. Выбарчыя камісіі былі сфармаваныя не ў адпаведнасьці з заканадаўствам. У выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў не былі ўключаныя прадстаўнікі палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў, якія апаніруюць рэжыму. Многія ўчастковыя выбарчыя камісіі складаліся з прадстаўнікоў аднаго прадпрыемства або ўстановы, а кіраўніком камісіі прызначаўся прадстаўнік адміністрацыі гэтага прадпрыемства (установы). У склад большасьці выбарчых камісіяў быў уключаны прадстаўнік выканаўчай дзяржаўнай адміністрацыі, які, фактычна, кіраваў камісіяй. Раённыя выбарчыя камісіі знаходзіліся ў будынках раённай дзяржаўнай адміністрацыі і былі пад кантролем гэтай адміністрацыі. У склад выбарчых камісіяў уключаліся нават асобы, якія не зьяўляюцца грамадзянамі Беларусі (грамадзяне Расеі).

2. Фармаваньне сьпісаў выбаршчыкаў праводзілася з грубымі парушэньнямі. Гэтыя сьпісы фармаваліся паводле дадзеных мясцовых камунальных службаў, у якіх не адлюстроўваецца ані грамадзянства плацельшчыкаў, ані іхная прысутнасьць на момант выбараў, ані факт іхнага фактычнага перабываньня, а толькі іхная прапіска. Сьпісы ня былі ўдакладненыя, таму падчас галасаваньня назіральнікі выявілі факты галасаваньня неграмадзянаў Беларусі. Многія грамадзяне, прышоўшы галасаваць, не знаходзілі сябе ў сьпісах. У сьпісы ўключаліся і памерлыя. Пры такім фармаваньні сьпісаў камісіі дазвалялі галасаваць людзям, уносячы іх у дадатковыя сьпісы, не патрабуючы ад іх дакумантаў.

3. Маштабныя фальсіфікацыі адбыліся пры так званым „папярэднім галасаваньні". Асабліва гэта было выяўлена ў сельскай мясцовасьці, дзе адміністрацыя арганізавала прымусовае галасаваньне значнай большасьці выбаршчыкаў (да 60%). Людзей прывозілі на аўтобусах на месца галасаваньня ў працоўны час, выкарыстоўваючы адміністрацыйны ўціск і пагрозы. У школах, дзе знаходзіліся выбарчыя

ўчасткі, спэцыяльна склікалі бацькоўскія сходы, пасьля якіх людзей заклікалі датэрмінова прагаласаваць. Такія ж парушэньні адбыліся на шэрагу ўчасткаў у гарадзкой мясцовасьці. Нават значна заніжаныя афіцыйныя зьвесткі (15%) Цэнтральнай Выбарчай Камісіі аб выніках папярэдняга галасаваньня сьведчаць аб адміністрацыйным ціску пры арганізацыі папярэдняга галасаваньня. Вынікі папярэдняга галасаваньня былі поўнасьцю сфальсіфікаваныя, бо скрыні і бюлетэні для галасаваньня знаходзіліся па-за кантролем грамадзкасьці, у распараджэньні ўладаў.

4. Выбарчыя камісіі і выканаўчыя структуры ўлады рабілі максімальныя перашкоды назіральнікам. На шмат якіх выбарчых участках назіральнікам, насуперак закону, было адмоўлена ў акрэдытацыі. Дакументы назіральнікаў ад *Партыі БНФ* былі выдадзеныя Партыяй у аднолькавай форме. У выніку большасьць назіральнікаў атрымала акрэдытацыю, у тым ліку ў ЦВК. У той жа час на некаторых выбарчых участках назіральнікам *Партыі БНФ* было адмоўлена ў акрэдытацыі. Месцамі кіраўніцтва выбарчых камісіяў пагражала назіральнікам пазбавіць іх акрэдытацыі, калі тыя патрабавалі прадставіць ім інфармацыю пра ход выбараў. Нават меліся выпадкі фізічнага і псіхалягічнага гвалту ў адносінах да нашых назіральнікаў з боку кіраўніцтва выбарчых камісіяў і міліцыі. У шэрагу выпадкаў нашых назіральнікаў гвалтоўна выдалілі з участкаў. Асноўныя фальсіфікацыі рабіліся пры падліку галасоў датэрміновага і асноўнага галасаваньня. Літаральна на ўсіх выбарчых участках месцы падліку галасоў былі арганізаваныя такім чынам, каб назіральнікі не маглі назіраць за працэсам падліку. Міліцыя ўмешвалася і дапамагала аддаляць назіральнікаў ад месцаў падліку. Назіральнікі маглі бачыць толькі плечы членаў камісіі на адлегласьці 6-10 мэтраў. Любыя спробы наблізіцца да месца падліку тут жа гвалтоўна прыпыняліся міліцыяй. Падчас падліку галасоў у памяшканьні знаходзіліся пабочныя асобы, якія мелі доступ да падліку бюлетэняў. Падчас падліку ў некаторых выпадках назіральнікі заўважылі, што колькасьць бюлетэняў зьвяраецца зь нейкімі нефармальнымі сьпісамі. Назіральнікам адмаўлялі ў інфармацыі па статыстыцы галасаваньня на розных этапах, пра колькасьць выбаршчыкаў і г.д.

5. ***На ўсіх участках была выяўлена дыскрымінацыя дзяржаўнай беларускай мовы.*** Інфармацыя была толькі па-расейску. На большасьці ўчасткаў былі вывешаныя толькі агітацыйныя матэрыялы кандыдата Лукашэнкі.

6. У раённых выбарчых камісіях, якія знаходзіліся ў будынках дзяржаўнай улады, праца па падліку зьвестак з пратаколаў участковых камісіяў была арганізаваная такім чынам, што назіральнікі ня мелі доступу да гэтых пратаколаў і да працэсу іх апрацоўкі. Паколькі ўся гэтая праца вялася ў розных пакоях, куды назіральнікаў не дапускалі, а паведамлялі ім толькі канчатковыя лічбы. У той жа час у будынку знаходзілася кіраўніцтва выканаўчай адміністрацыі, якое мела доступ да гэтых дакумантаў.

***Кіраўніцтва Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”***

*12 верасьня 2001 г.*

# У ВІЦЕБСКУ

Суддзя **Сьвятлана Туфан** тры разы пераносіла суд над сябрам *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімерам Плешчанкам***. Складзены чатыры пратаколы затрыманьняў (арганізацыя несанкцыянаваных пікетаў).

19 чэрвеня *Ул. Плешчанку* прысудзілі штраф — 150 мінімальных заробкаў (каля 600 даляраў). Гэта ўжо трэці штраф сёлета, і беспрацоўны *Ул. Плешчанка* мусіць сплаціць 450 мінімальных заробкаў (1800 даляраў). І гэта пры сярэдняй зарплаце 30 даляраў у месяц.

Паводле словаў *Уладзімера Плешчанкі*, гэта немагчыма. Затое куды больш верагодна ізноў пабачыць віцебскага змагара ля „сіняга дому” з новым плякатам і літаратурай *„Беларускай Салідарнасьці”*.

***(З радыё. Б. Станкевіч)***

# КАНФЛІКТ ДАВІДА З ГАЛІЯФАМ

Няшчасьце, якое здарылася ў Амэрыцы 11-га верасьня ў выніку нападу таямнічых авіаэкстрэмістаў на Нью-Ёрк і Вашынгтон, уразіла сьвет сваёй жорсткасьцю, разбуральнай выніковасьцю і бездапаможнасьцю Амэрыкі.

Я шаную Амэрыку, зычу ёй дабра і квітненьня. Аднак узрушэньне, якое завалодала палітыкамі, імкненьне тут жа зьнішчыць нябачнага і нібыта „слабога ворага”, вымушае мяне ўзяцца за пяро. Для мяне абсалютна відавочна, што палітычныя рашэньні, якія прымаюцца на пачуцьцях, заўсёды накіраваныя толькі на бліжэйшыя мэты. Як правіла, ім нестае прадуманасьці, усьведамленьня магчымых адмоўных вынікаў. Мэта ацэньваецца як рэальнасьць. Але ў працэсе яе дасягненьня сітуацыя можа рэзка пераменіцца, і кантраляваць новыя дачыненьні стане немагчыма.

Пасьпешныя дзеяньні супраць адной усходняй краіны могуць перамяніць сітуацыю і скансалідаваць людзей на Ўсходзе супраць Амэрыкі. Тады, ня гледзячы на палітычныя пазыцыі ўсходніх урадаў, ворагам Амэрыкі стане ўвесь Усход.

Я мяркую, што, ва ўмовах цяперашняга сьвету, збройны канфлікт з Усходам можа быць фатальным для Эўропы і Амэрыкі. На жаль, на Захадзе шмат хто не разумее, што калі будзе дапушчаная памылка, то ваяваць прыдзецца не зь дзяржавамі на Ўсходзе, а зь людзьмі.

Ніякая эканамічная магутнасьць, ніякая супэртэхніка і ніякія спосабы яе ўжываньня ня могуць перамагчы перакананага чалавека. Нават ядзерныя ўзрывы не прынясуць Захаду перамогі, калі будуць парушаныя справядлівасьць, суверэнітэт і гонар людзей на Ўсходзе. Злачынства тэрарызму, перш чым будзе пакаранае, мусіць быць дакладна ідэнтыфікаванае і даказанае.

Захад ня выйграў ніводнай вайны зь „беднымі народамі” на Ўсходзе (Карэя, Індакітай, В’етнам, Індыя, Алжыр, Конга і г.д.), але, на жаль, не зрабіў з гэтага высноваў. Пасьпешнае, недакладна акрэсьленае і прыблізна вызначанае ўжываньне высокатэхнічнай зброі можа маральна салідарызаваць Усход. Вайна „беднага Ўхсходу” супраць ЗША (якая, дарэчы, вядзецца ўжо даўно малымі, нябачнымі сіламі) можа ператварыцца ў сусьветную партызанскую вайну Давіда з Галіяфам, якая будзе тлець дзесяцігоддзямі, ператворыць у кашмар жыцьцё ў Эўропе і ў Амэрыцы і можа скончыцца вядомым па антычнай легендзе канцом.

* * *

Амэрыцы варта задумацца глыбей, у чым прычына нянавісьці да яе з боку краінаў, бедных эканомікай і жыцьцёвым узроўнем, але багатых гісторыяй і духоўнай культурай. Амэрыканскае грамадзтва шмат выйграла б, калі б глянула ў глыбіню сябе, калі б зірнула на сябе збоку і знутры, заўважыла б свае маральныя эрозіі і недахопы.

На добры лад, перад абліччам вялікага і зьнешне таемнага, малазразумелага канфлікту Ўсходу з Амэрыкай, ня варта супакойваць сябе тлумачэньнямі пра неабходнасьць помсты антылюдзкаму арабскаму тэрарызму. Разумней было б амэрыканцам задаць сабе пытаньне: чаму, маўляў, яны, на Ўсходзе, нас, амэрыканцаў, ненавідзяць? Чым мы ім не падабаемся? Што яны хочуць сцьвердзіць, чаго дасягнуць? Мудра было б увогуле зразумець усходнюю мэнтальнасьць людзей Азіі і паўночнай Афрыкі. Тых, каго называюць „тэрарыстамі” — гэта не піраты. Яны гінуць не дзеля матэрыяльных каштоўнасьцяў. Гэта таксама ня ёсьць вар’яты, а цалкам нармальныя і сацыяльна адаптаваныя людзі. Але яны іншыя. Дык якія ж яны?

На жаль, рэчаіснасьць сьведчыць, што зрабіць паварот у сваёй сьвядомасьці простаму амэрыканцу вельмі цяжка. Ён перакананы, што

яго краіна найлепшая, што сам ён таксама найлепшы, і не цікавіцца іншымі. І, што самае горшае, — ня хоча цікавіцца, ня хоча нічога ведаць. Абмежаванасьць ведаў пра сьвет у шэраговых людзей багатай і высокатэхнічнай Амэрыкі проста шакуе.

Зрэшты, на высокім узроўні амэрыканцы разумеюць свае праблемы. Толькі ці паўплывае гэта на выбар паводзінаў цяпер?

Ёсьць язвы ў амэрыканскім грамадзтве, экспарту якіх ня ўспрыме і не дапусьціць ні адзін народ на Ўсходзе (і ня толькі на Ўсходзе). Можа, ня ў сіле і не ў багацьці справа?

Канфліктныя дачыненьні цывілізацыяў ня выправіш бомбамі ды самалётамі, не палепшыш вайной.

Раптоўнае, нечаканае, на вачах ўсяго сьвету, хуткае і шокавае разбурэньне прымітыўнымі экстрэмістамі найвышэйшых будынкаў у ЗША (сьведчаньняў багацьця фінансава моцнай Амэрыкі), — ўспрымаецца як жудасны сымвал. Можа, гэта знак для Амэрыкі? Можа, гэта заклік павярнуцца да каштоўнасьцяў духу? Можа, гэтая страшная ахвяра ў шмат тысячаў загубленых жыцьцяў мае нейкі таемны зьмест?

Ілюзія сілы, увасобленая ў ваеннай, фінансавай і таварнай матэрыі, можа рассыпацца ў пыл і груду руінаў.

* * *

Заклікі татальна зьнішчаць тэрарызм паўсюдна, ва ўсіх яго праяўленьнях, правільныя, на жаль, толькі тэарэтычна. На практыцы, у цяперашняй палітычнай рэальнасьці, гэта можа абярнуцца масавай несправядлівасьцю, парушэньнем правоў нацыянальных мяншыняў і генацыдам іхняга насельніцтва.

Схема такая. Нейкі дзяржаўны рэжым пачынае парушаць правы, а потым і рэпрэсаваць нейкую нацыянальную меншасьць ці групу людзей. Тыя, абараняючы жыцьцё і сваё існаваньне, пачынаюць змагацца ў адказ. Тады рэжым аб'яўляе іх тэрарыстамі і пачынае зьнішчаць, ужо зыходзячы і з сілы, і з права.

Выразны прыклад — тэрарыстычная Расея, якая ўжо некалькі гадоў вядзе шырокамаштабную вайну супраць мікраскапічнай Чачэніі і праводзіць генацыд чачэнскага насельніцтва (пры стрыманых, на жаль, і пасіўных паводзінах заходніх краінаў).

Чатыры гады таму, калі закончылася 1-я Расейска-Чачэнская вайна, быў падпісаны ***„Дагавор аб міры і прынцыпах мірных узаемаадносінаў”***. Яго падпісалі законныя, усенародна абраныя прэзыдэнты — Аслан Масхадаў і Барыс Ельцын, — дзе было заяўлена на ўвесь сьвет ***„аб спыненьні ваеннага супрацьстаяньня Расеі і Чачэніі, якое доўжылася цягам чатырох стагоддзяў”***.

Цяпер расейцы вядуць новую вайну супраць Чачэніі з ужываньнем усіх відаў зброі з расейскага боку (акрамя атамнай). Рускія накіравалі 150-тысячную армію супраць 5-тысячнай чачэнскай, разбамбавалі і ператварылі ў руіны паўмільённую чачэнскую сталіцу і іншыя гарады, забілі больш за 130 тысячаў мірных людзей у краіне, насельніцтва якой не дасягае і аднаго мільёна жыхароў; сотні тысячаў выгналі з Чачэніі ва ўцякацтва, тысячы замкнулі ў фільтрацыйныя лягеры, дзе катуюць і забіваюць мірных цывільных людзей. І ўсё гэта называюць „антытэрарыстычнай апэрацыяй”. Бо расейцы разумеюць, што назваўшы ўсё сваім імем (вайну вайной, а генацыд — генацыдам), — трэба будзе выконваць (альбо парушаць) Жэнэўскую Канвэнцыю пра ваеннапалонных, Усеагульную Дэклярацыю аб правах чалавека і іншыя міжнародныя прынцыпы і пагадненьні. А так рускія дазволілі сабе збамбаваць і зьнішчыць цэлую суверэнную краіну, забіваюць малалікі свабадалюбны народ, і не жадаюць несьці за гэтае злачынства супраць чалавецтва ніякай адказнасьці.

Цяпер расейскія палітыкі вайны хочуць скарыстаць бандыцкі напад на Амэрыку ў сваіх інтарэсах, каб апраўдаць генацыд чачэнцаў. Рускія палітыкі заяўляюць аб сваёй гатовасьці, разам з Амэрыкай, зьнішчаць тэрарызм „ісламскі, чачэнскі, ня важна, які”. Некаторыя дагаварыліся нават, што напад на ЗША зроблены пры дапамозе і з удзелам чачэнцаў. (Якія, акрамя як на сябе, спадзяюцца, між іншым, толькі на Амэрыку.)

Але барацьба суверэннай Чачэніі за свабоду і незалежнасьць супраць рускай агрэсіі ня мае дачыненьня да тэрарызму. Тэрор праводзіць якраз руская армія і рускія спэцслужбы.

* * *

Кожны народ валодае натуральным правам на незалежнасьць і свабоду, мае права абараняць незалежнасьць і, калі яе няма, — змагацца за яе. Кожны народ, калі яго вынішчаюць, мае права абараняцца ўсімі даступнымі і магчымымі сродкамі.

Заклік „паўсюдна зьнішчаць” і „ва ўсім сьвеце”, без усебаковага аналізу і ўліку палітычнай рэальнасьці, можа прывесьці да падмены паняцьцяў у рэальнай палітыцы, можа ня вырашыць праблему, а толькі ўскладніць яе, узаконіць забойствы і гвалт, легалізаваць рэпрэсіі, пашырыць маштабы тэрору.

На мой погляд, патрэбна дакладнае вызначэньне тэрарызму і выразнае называньне канкрэтных дзеяньняў, доказнасьць аргумантаў, завершанасьць сьледства, устанаўленьне віны. Мусіць быць зразумеласьць. Усход не павінен успрымаць ваяўнічыя заявы як новы крыжовы паход.

Існуе небясьпека, калі Захад можа аказацца перад праблемай, што, каб перамагчы „тэрарызм”, неабходна зьнішчыць цэлыя народы. Але трэба памятаць, што партызаны Ўсходу (як гэта ні жахліва) могуць ператварыць у руіны Жэнэву ці Брусэль, а заходнім арміям немагчыма зьнішчыць народ. (Гэта выглядала б злачынствам супраць чалавецтва.)

Вялікай небясьпекай для Амэрыкі і для Эўропы была б партызанская вайна з Усходам. Яе неабходна пазьбегнуць. Бо гэта заўсёды — вайна бяз правілаў, дзе сіла вымяраецца, з аднаго боку, авіяносцамі, ракетамі ды самалётамі сістэмы „Стэлс”, з другога — сілай чалавечай апантанасьці. І, паўтаруся, яшчэ не было выпадку ў найноўшай гісторыі, каб самалёты перамаглі апантанага чалавека, які не баіцца сьмерці.

На маю думку, трэба заўсёды і найперш — старацца пра супрацоўніцтва і гуманную кансалідацыю сьвету, цаніць міжлюдзкія дачыненьні.

Тым часам складваецца ўражаньне, што ў паветры запахла вайной. Зьявілася шмат галасоў, якія толькі і гучаць: „Зьнішчыць!”, „Забіць!” Але калі прааналізаваць усё спакойна, то прыходзіш да высновы, што ў трагічных выпадках 11 верасьня трэба найперш дакладна ўстанавіць арганізатараў, кіраўнікоў і спонсараў нападу (выканаўцы загінулі). І толькі тады прымаць захады і ажыцьцяўляць рашэньні. Лепш за ўсё, каб гэта быў паказальны судовы працэс з удзелам усіх зацікаўленых краінаў, а не ваеннае забойства, якое (можна не сумнявацца) пацягне за сабой новыя забойствы.

* * *

Я падтрымліваю Амэрыку, бо разумею, што на гэтую краіну абапіраецца цяперашні сьвет і цяперашняя Эўропа. Я падтрымліваю амэрыканскі народ, бо ведаю яго дабразычлівасьць. Бо крыўда і страты зробленыя яму — несправядлівыя, і людзі загінулі, ні ў чым і ні перад кім не вінаватыя.

Але Амэрыка прымае цяпер вельмі адказныя рашэньні, якія могуць уплываць на далейшы ход гісторыі XXI-га стагоддзя. На мой погляд, у такім становішчы ніхто і нідзе на сьвеце не павінен заставацца абыякавым ці ацэньваць падзеі толькі на пачуцьцях. Патрэбна дыскусія і разумнае асэнсаваньне.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*14 верасьня 2001 г., Варшава*

# БЕЛАРУСЫ ПАД АКУПАЦЫЯЙ:

## *Спусташэньне*

*(Успамінае Станіслаў Ляшковіч, Маладэчна)*

Кожны раз сьлёзы горычы і ўспамінаў душаць мяне, як еду электрычкай з Маладэчна ў Менск. Сэрца абліваецца крывёю, калі

праносяцца станцыі *Баяры, Ласі, Уша.*За вакном праплываюць сумныя пейзажы лысых пагоркаў. Я памятаю іх іншымі. У гады маёй маладосьці яны былі пакрытыя сасновымі лясамі і служылі прытулкам для шматлікіх зьвяроў ды птушак. Але ў 60-я гады (у эпоху гігантаманіі ды „ўтаймаваньня" прыроды) крамлёўскія разумнікі, начале з Хрушчовым, спусьцілі загад Машэраву пашырыць у Беларусі пасяўны клін на тры мільёны гэктараў і засеяць кукурузай для жывёлагадоўчых комплексаў. Вось тады і зьніклі сасоньнікі з пагоркаў. Іх бязьлітасна выкарчавалі трактарамі „Кіравец"* і ўзаралі сямілямешнымі плугамі.

Так зьніклі стужкі і выспачкі жывой прыроды, гнезьдзішчы для курапатак, зайцоў, лісіц, вожыкаў ды іншай жыўнасьці.

Пачалася дэградацыя гэтых земляў. Пазбаўленыя лясного покрыва, пагоркі сталі лёгкай здабычай вятроў ды ліўняў, а хімізацыя гэты працэс яшчэ больш паскарае. Так спакваля адбываецца спусташэньне зямлі, ператварэньне яе ў пустэчу.

Хочацца запытацца, ды няма ў каго, чаму зьніклі Красьненскія ды Маладэчанскія чубкі лясоў, балоты, крыніцы. Багацейшымі ад гэтага калгасы ня сталі, наадварот, паступова апусьціліся да поўнага жабрацтва. І зьдзек над прыродай працягваецца. Сёньня ў адным толькі Лагойскім раёне Менскай вобласьці **19** піларамаў штодня рэжуць лес на піловачнік ды накіроўваюць фуры за мяжу. Зьвіняць сякеры ды пілы ў зялёнай зоне сталіцы. На вачах аднаго пакаленьня мая краіна становіцца лесастэпам. Усеагульная беднасьць ды хцівасьць таму прычынай. Куды ідзём, куды?! Што пакінем нашчадкам?

***(Паводле радыё Свабода)***

## *Расказ маці*

*(Успамінае Сьвятлана Захарэвіч, Менск)*

Я нарадзілася ў Менску 10 чэрвеня 1941 году, а праз два тыдні пачалася вайна. Бацька, Леанід Васільевіч Сарокін, працаваў шафёрам у Саўміне. У першы дзень вайны ён атрымаў позву ў ваенкамат. Маці, Галіна Мікалаеўна Сарокіна, у дзявоцтве Карташова, засталася сама са мной і старэйшым братам. Людзі ўцякалі з гораду, хто куды. Маці вырашыла ехаць да свайго бацькі, які жыў на Ўкраіне, на станцыі Мена.

На вакзале, каб патрапіць у вагон, трэба было прыняць удзел у штурме. Каб не задушылі немаўля, маці паклала мяне ў чамадан, зрабіўшы ў ім дзіркі. Моцна трымаючы за руку дзесяцігадовага брата, а ў другой руцэ чамадан, яна такі трапіла ў вагон цягніка, што ішоў у бок Украіны.

Па дарозе нас пачалі бамбаваць нямецкія самалёты. Людзі пабеглі ў бок невялічкага лесу, каб схавацца. У час зацішша, калі самалёты адляцелі, маці дастала мяне з чамадана і пачала карміць. Люд ад зьдзіўленьня войкнуў. Прыдумалі, як прывязаць дзіця. Нехта даў маці хустку ці тонкую посьцілку, а чамадан выкінулі.

Зь вялікімі цяжкасьцямі мы дабраліся да станцыі Мена, дзе сустрэліся з роднымі. Калі прыйшлі немцы, маці праз некаторы час атрымала позву ў камэндатуру. Там люду было шмат. Паводле сьпісаў, людзей пачалі грузіць на грузавікі. Маці ў сьпісе была апошняй. Калі яна стала на прыступку машыны, то немец гукнуў ёй некалькі разоў „вэк!", ткнуўшы прыкладам у бок. Маці ведала нямецкую мову. Але спалоханая, зьбянтэжаная, ізноў ступала на тую прыступку. Тады немец штурхануў яе з усяе сілы так, што яна зь дзіцем пакацілася ў глыбокі роў, які цягнуўся ўздоўж дарогі. Апамятаўшыся, маці ўбачыла, што машыны ад'ехалі недалёка. Людзей вывелі, паставілі ўздоўж рову і ўсіх расстралялі.

У бяспамяцтве маці дабралася да бацькоў. Толькі праз доўгі час даведалася, што нехта з суседзяў данёс немцам, што яе муж „чырвоны камісар", і яе занесьлі ў сьпіс пад шыфрам „А", г. зн. на зьнішчэньне. А той немец, мабыць, пашкадаваў жанчыну зь немаўляткам і такім чынам вырашыў дараваць нам жыцьцё. Выходзіць, што немец, фашыст, акупант зжаліўся над намі.

А вось 18 траўня 2001 году, амаль праз 60 год пасьля вайны, ужо не нямецкія акупанты, а акупанты „славяне" з аховы „прэзыдэнта" Лукашэнкі, падчас лукашэнкавага так званага „ўсенароднага сходу", гатовыя былі мяне забіць.

Раніцай я прыйшла на Цэнтральную плошчу сталіцы, каб выказаць свой пратэст разам зь іншымі беларусамі, якія ня згодныя з палітыкай „прэзыдэнта" і не жадаюць, каб іх дзеці і ўнукі зноў сталі гарматным мясам дзеля імпэрскіх інтарэсаў Расеі. Людзі сабраліся, каб выказацца ў абарону суверэнітэту і незалежнасьці нашай дзяржавы.

Калі дэманстранты засьпявалі „***Магутны Божа"***, пад'ехалі аўтобусы, зь іх выскачылі мужчыны „ў цывільным" і пачалі ўсіх зьбіваць ды цягнуць у буды-крумкачы, што пад'ехалі за нашымі плячыма. Я ўбачыла бледны твар цяжка параненага *Уладзімера Юхо*, калі яго запіхвалі ў машыну. (Потым я даведалася, што яму ў двух месцах зламалі руку і рэбры, білі па нырках ботамі.) Я закрычала: „Што вы робіце!?". Кінулася да „крумкача". І вось чую каманду адзінага, што быў у ваеннай уніформе: „Хапайце й яе!"

Двое здаровых дзецюкоў пачалі валачы мяне ў бок машыны. Але *Уладзімер Раманцоў* пачаў абараняць мяне ад бандытаў. Яго і *А. Радзюка* перад маімі вачыма пацягнулі з заламанымі рукамі. А я ўпала на асфальт, губляючы прытомнасьць. (Потым на судзе *У. Раманцова* судзілі за тое, што ён абараняў мяне.) Бандыты зноў пацягнулі мяне. Я ім паказала пасьведчаньне інваліда, але яны ўся роўна дацягнулі мяне да слупа і кінулі. Там нейкая жанчына патрабавала, каб выклікалі па мабільным тэлефоне хуткую дапамогу. Але „гарылы" цягнулі мяне на прыпынак каля ўнівэрсаму „Цэнтральны". Сэрца білася так моцна і хутка, што гатова было выскачыць з грудзей. Пад'ехала „хуткая". Гэбісты здымалі на відэастужку і медыкаў. Мне зрабілі два ўколы, адвезьлі ў шпіталь.

З Божай ласкі я выжыла. І цяпер чамусьці ўспомніўся той расказ маці, як немец зжаліўся над намі. Гэтыя, што валаклі, білі і зьдзекаваліся зь мяне, сталай жанчыны-інваліда, гэтыя, калі б атрымалі нямецкі загад, сумняваюся, каб мелі да нейкага жаласьць.

---

* „Кіравец" — вельмі няўдалая канструкцыя цяжкага расейскага трактара, які сваёй вагой трамбаваў зямлю і зьнішчаў урадлівасьць глебы. (рэд.)

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

## *ТРАВЕНЬ*

*1 траўня* на афіцыйным першатравеньскім мітынгу ў Горадні, які праводзіўся ўладамі, быў затрыманы міліцыяй лідэр гарадзенскай Маладой Грамады ***Валянцін Аскірка*** за тое, што трымаў у руках беларускі сьцяг. Напярэдадні мітынгу і падчас яго асобы ў цывільным і ў міліцэйскай форме хапалі людзей, пераважна моладзь. ***Сьвятлану Нех*** з Маладой Грамады яны цягнулі праз увесь пляц. Затрымалі 20 асобаў,. Сярод іх былі схопленыя старшыня мясцовай філіі Маладога Фронту ***Вадзім Саранчукоў***, сябры БНФ „Адраджэньне" ***Зьміцер Іваноўскі, Валеры Кісель***, ***Вераніка Быстрыцкая***, ***Андрэй Мялешка***, ***Андрэй Сьцяпура***, ***Міхал Патрэба***, ***Мішык Айрапецьян*** (незалежныя прафсаюзы), два журналісты: ***Міхаіл Карневіч*** з „Біржы інфармацыі" і ***Павал Мажэйка*** з „*Пагоні".* Міліцыянты канфіскавалі *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг,* а іх самых адвезьлі ў Ленінскі РАУС.

*1 траўня* на афіцыйным мітынгу *ў Гомелі* міліцыянты паспрабавалі затрымаць рабочых ***Анатоля Паплаўнага*** і ***Івана Адаменку***, якія трымалі плякаты „Сусьветным цэнам — сусьветны заробак". Іх абаранілі іншыя ўдзельнікі мітынгу.

*1 траўня ў Берасьці*, падчас першатравеньскага шэсьця, арганізаванага ўладамі, былі затрыманыя ***Ўладзімер Вялічкін*** і ***Кірыла Данько***. Яны распаўсюджвалі газэту, прысьвечаную праблемам і наступствам аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

*2 траўня* ў судзе Савецкага раёну Менска адбыліся судовыя працэсы па адміністрацыйных справах сяброў Маладога Фронту, затрыманых 21 красавіка: ***Зьміцера Касьпяровіча*** *(суд перанесены на 3 траўня);*

*Аляксея Шэйна (папярэджаньне); Зьміцера Ятчэні (суд перанесены на 11 траўня), Міхаіла Шаўцова (папярэджаньне).*

*2 траўня ў Горадні* пачаўся суд над ***Валянцінам Аскіркам***, якому інкрымінавалі арт. 156 КаАП (дробнае хуліганства). Сьведкі (супрацоўнікі міліцыі) блыталіся ў паказаньнях. Чацьвёра сьведкаў з боку В. Аскеркі засьведчылі, што ягоныя дзеяньні зусім не нагадвалі хуліганскія, ён толькі прыладжваў *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* да дрэўка пад сьцяг. Суддзя **Дземчанка** перанёс судовае паседжаньне. Будуць шукаць новых сьведкаў.

*4 траўня, Барысаў.* Суддзя **А**.**Болатаў** прысудзіў ***Алесі Ясюк*** за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце 150 мінімальных заробкаў. Алесю Ясюк прывезьлі з працы ў будзе-“крумкачы” ў кабінэт суддзі. Там жанчына працягвала сваю акцыю грамадзянскага непадпарадкаваньня (не адказвала на пытаньні суддзі). На вачах суддзі яна завязала рот чырвона-зялёнай анучай (на знак адсутнасьці свабоды слова ў беларускай дзяржаве).

*4 траўня* ў РУУС Партызанскага раёну Менска пачалося ўнутранае службовае рассьледваньне па факце зьбіцьця ***Кацярыны Шабан*** лейтэнантам міліцыі 21 красавіка пасьля заканчэньня акцыі „Канчатковы дыягназ”. Кацярына Шабан прыехала ў РУУС Партызанскага раёну разам са сваім адвакатам, напісала тлумачэньне аб тым, як і пры якіх абставінах яе зьбівалі і пакінула заяву на імя начальніка РУУС. У зыскавай заяве ў суд Кацярына напісала: „Чалавек у цывільным размахнуўся і з усяе моцы ўдарыў мяне па галаве. Я адляцела




***18 траўня на Цэнтральнай плошчы ў Менску***

да сьцяны і выцялася галавой аб сьцяну. Я пачала крычаць, што мяне б’юць. Потым убачыла, што ён, ухмыляючыся, ідзе да мяне. У мяне ў вачах пацямнела, у галаве зашумела. Пачало ванітаваць, і я страціла прытомнасьць. Апрытомнела пазьней ад страшнага ўдару галавой аб падлогу...“

Міліцыянта, які зьбіваў Кацярыну Шабан, завуць **Уладзімер Новікаў**. Яму 25 гадоў. Атрымаў вышэйшую адукацыю (настаўнік), па разьмеркаваньні ваенкамату трапіў служыць ва ўнутраныя войскі. Адтуль пайшоў працаваць у міліцыю, у партызанскі РУУС. Бацька яго — старшыня сельсавету.

*7 траўня* дэкан хіміка-тэхналягічнага факультэту Магілёўскага Дзяржаўнага Тэхналягічнага ўнівэрсітэту **Т**. **Піскун** выклікала да сябе 7 сяброў магілёўскай суполкі Задзіночаньня беларускіх студэнтаў і пагражала ім выключэньнем з інстытуту, калі яны ня спыняць сваёй дзейнасьці ў ЗБС.

*7 траўня* арганізацыя „Прававая абарона насельніцтва” арганізавала пікет каля будынку пракуратуры Беларусі ў Менску. Міліцыя пад камандай сумнавядомага намесьніка начальніка Цэнтральнага РАУС сталіцы **Барсукова** затрымала 3-х удзельнікаў акцыі: ***А. Случака, Ігара Гайшона*** і ***Сяргея Стрыжонка***. 8 траўня у Цэнтральным судзе *І.Гайшону* прысудзілі штраф *20 тысячаў рублёў*, а *С.Стрыжонку — 50 тысячаў.*

*7 траўня* ***Зьміцер Фядорчанка, Алесь Барадуля, Сяржук Падзолка*** *і непаўнагадовая* ***Тацьцяна Ясюк*** з Барысава выйшлі на Цэнтральную плошчу ў Менску, трымаючы ў руках плякаты з надпісамі: *„Дзе Захаранка?”, „Хто наступны?”, „Дзе зьніклыя людзі?”*. Пікетоўшчыкі пасьпелі толькі разгарнуць свае плякаты, як адразу ж былі затрыманыя і дастаўленыя ў пастарунак. *Сяржука Падзолку* і *Тацьцяну Ясюк* адпусьцілі без складаньня пратаколу.

*8 траўня* ў судзе Цэнтральнага раёну Менска адбыўся суд над *Зьміцерам Фядорчанкам.* Суддзя **Вайцяховіч** вынесла яму прысуд па арт. 167.1 КаАП (несанкцыянаваны пікет): штраф у памеры 20 мінімальных заробкаў. Суд над *Алесем Барадулем* перанесены на 14 траўня.

*Травень.* Шматдзённую галадоўку пратэсту трымала ў Бабруйску старшыня Незалежнага прафсаюзу шыннага камбінату ***Алена Захожая***. Яна патрабавала , каб адміністрацыя прадпрыемства прадставіла даведку пра наяўнасьць у прафсаюза юрыдычнага адрасу, які патрэбны для рэгістрацыі мясцовымі ўладамі суполкі дэмакратычнага прафсаюза.

*8 траўня, Менск.* Выканаўца абавязкаў старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Юры Беленькі*** зноў паўстаў перад судом. Разглядалася ягоная справа, якая была заведзеная пасьля падзеяў 25 Сакавіка. Ён быў абвінавачаны ў правядзеньні несанкцыянаванага шэсьця па праспэкце Скарыны і асуджаны да 15-ці сутак адміністрацыйнага арышту. За кратамі спадар *Беленькі* адбыў 9 дзён, бо гарадзкі суд адмяніў ранейшы прысуд і вярнуў справу на новае разьбіральніцтва.



***Напад „людзей у цывільным”***

Было прызнана, што пратаколы, складзеныя на *Ю.Беленькага* са шматлікімі парушэньнямі, якія (чамусьці) не заўважылі суддзі Цэнтральнага раённага суду. 8 траўня суддзі ўважліва выслухалі сьведкаў і міліцыянтаў. Падрабязна разьбіраліся з паказаньнямі міліцыянта **Аляксандра Барсукова** (намесьніка кіраўніка Цэнтральнага РАУС), па загаду якога складаліся пратаколы на сп. Беленькага, прызнаныя потым недасканалымі. Высьветлілася, што *Ю. Беленькага* трэба апраўдаць і ранейшы прысуд адмяніць.У выніку такога павароту суддзя **Паўлючук** адклала суд. Прысуд ня вынесены.

Адвакат Ю. Беленькага Вера Страмкоўская сказала, што працэс дае ўсе падставы, каб выказаць недавер суддзі.

*8 траўня* ў судзе Савецкага раёну Менска адбылося судовае паседжаньне па адміністрацыйнай справе лідара Маладога Фронту ***Паўла Севярынца*** (абвінавачваньне ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі „Малады Фронт”; арт. 167 ч.1 КаАП). Аднак судовае паседжаньне было зноў перанесенае на 16 траўня.

*Травень.* Горадзенскі мастак ***Зьміцер Іваноўскі***, старшыня таварыства вольных майстроў і актывіст мясцовай арганізацыі БНФ „Адраджэньне”, атрымаў прадпісаньне ад жыльлёва-эксплуатацыйнай службы №5 Горадні, згодна зь якім ён вымушаны да 10 траўня выселіцца са сваёй творчай майстэрні. У прадпісаньні ЖЭС абапіраецца на ўказ Лукашэнкі №302 ад 12 жніўня 1996 г. З. Іваноўскі заявіў карэспандэнту БелаПАН, што „дзеяньні ўладаў, скіраваныя на маё высяленьне з майстэрні,

зьяўляюцца лепшай адзнакай маёй творчай дзейнасьці, а гэта яшчэ больш пераконвае мяне, што я раблю нешта вартае для Беларусі. Другога рашэньня ад сёньняшняга рэжыму я і не чакаў.”

*10 траўня* ў судзе Партызанскага раёну разглядаліся справы ўдзельнікаў акцыі-пэрфомансу *„Дзень псіхічнага здароўя”*. ***Сяргею П'яных*** абвінавачваньне было прад'яўленае па арт. 167.1 ч.2 КаАП (удзел у несанкцыянаваным мітынгу паўторна, на працягу года). Суд вынес пастанову: 10 сутак адміністрацыйнага арышту. Судовага паседжаньня па справе ***Валеры Жэрбіна*** не адбылося. ***Яўген Афнагель*** атрымаў 3 сутак адміністрацыйнага арышту за ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу.

*10 траўня* была спыненая справа супраць жыхароў Барысава па арт. 368 ч.1 Крымінальнага кодэксу за адсутнасьцю складу злачынства. Сьледзтва прыйшло да высновы: у дзеяньнях грамадзянаў, якія запатрабавалі медыцынскай экспэртызы стану псіхічнага здароўя Аляксандра Лукашэнкі, складу злачынства няма. (Нагадаем: 16 студзеня на цэнтральнай плошчы Барысава адбыўся несанкцыянаваны пікет, які доўжыўся амаль паўгадзіны. Ягоныя ўдзельнікі — ***Алесь Абрамовіч, Алеся Ясюк, Надзея Грачуха, Зьміцер Кузьняцоў, Міхаіл Кузьняцоў*** — патрабавалі неадкладнай медыцынскай экспэртызы стану псіхічнага здароўя А. Лукашэнкі. Усе ўдзельнікі былі затрыманыя. У аддзяленьні міліцыі на іх былі складзеныя пратаколы адміністрацыйнага правапарушэньня па арт.167.1 ч.2 КаАП — парушэньне парадку арганізацыі ці правядзеньня масавых мерапрыемстваў. Суддзя **Аляксей Болатаў** вырашыў гэтыя справы не разглядаць, а накіраваў у пракуратуру на дасьледваньне, бо ўгледзеў ў дзеяньнях пікетоўшчыкаў іншае, крымінальнае, правапарушэньне лукашэнкавага Крымінальнага кодэксу (арт.368 ч.1: „зьнявага прэзыдэнта”, згодна якога, публічная зьнявага прэзыдэнта караецца штрафам ці папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, ці арыштам да шасьці месяцаў, ці абмежаваньнем волі да двух гадоў, ці пазбаўленьнем волі на той жа тэрмін). Але засталіся ў сіле пратаколы адміністрацыйнага правапарушэньня, суд па якіх яшчэ будзе наперадзе.

*10 траўня* Крычаўскі раённы суд асудзіў галоўнага рэдактара мясцовай незалежнай газэты „Новое поколение” ***Сяргея Баравікова*** да сямі сутак адміністрацыйнага арышту „за непадпарадкаваньне міліцыі”. (Яго затрымалі ў Менску ў парку Горкага 8 траўня. Пры даглядзе знайшлі і канфіскавалі ўлёткі і наклейкі.)

*11 траўня* на кватэру сп. ***Анатоля Крыварота***, адказнага сакратара *Ўправы Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, зьявіліся міліцыянты і запыталі, якая карэспандэнцыя паступае яму на ягоную абанэнцкую скрынку ў мясцовым паштовым аддзяленьні. Спадар Крыварот адказаў, што, паводле заканадаўства, мае права на тайну перапіскі і не разумее інтарэсу міліцыі без санкцыі пракурора. Міліцыянты запатрабавалі, каб ён пайшоў зь імі ў РАУС, але спадар Крыварот адмовіўся.

Павышаны інтэрас міліцыі да дзеячоў *Партыі БНФ* зьвязаны з набліжэньнем лукашэнкаўскага псэўданароднага „сходу”, які Партыя БНФ зьбіраецца сустрэць пратэстам.

*Травень. Менская рада Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны* зрабіла заяву з нагоды афіцыйнага адзначэньня Дня Перамогі. У заяве выказваецца абурэньне, што на афіцыйным паседжаньні, якое трансьлявалася па ўсіх каналах тэлебачаньня, ***не прагучала ніводнага беларускага слова і ніводнай беларускай песьні.*** Арганізатары „прадэманстравалі зьняважлівыя адносіны да дзяржаўнай беларускай мовы, да ўсяго беларускага народу”.

*13 траўня ў Смаргоні* сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Віктар Туравец*** прайшоў па ўсяму гораду зь *Бел-Чырвона-Белым Сьцягам* у руках. На грудзях і на плячах яго былі шыльды з надпісам: *„Гэта наш родны беларускі сьцяг”*. Ля райвыканкаму акурат у гэты час сабралася мясцовая „вертыкаль” і сагнаныя людзі. Адбывалася афіцыйнае „сьвята лукашысцкага сьцяга і гэрба”. Спадара Тураўца адразу затрымала міліцыя. Віктар крыкнуў: *„Жыве вольная Беларусь!”*. У пастарунку на яго склалі ажно пяць пратаколаў: „аб затрыманьні”, „пікетаваньні”, „шэсьці”, „незаконным карыстаньні сьцягам”, „парушэньні пашпартнага рэжыму”.

*13 траўня, Віцебск.* ***Ірына Байдак, Натальля Завадзкая*** і ***Эдуард Бохан*** *з Горадні* выйшлі на шматлюдны прыпынак грамадзкага транспарту з плякатамі і наладзілі апытаньне людзей: хто за Беларускі сьцяг *Бел-Чырвона-Белы* і хто за лукашэнкаўска-савецкі зялёна-чырвоны. Праз паўгадзіны іх схапіла міліцыя Чыгуначнага раёну Віцебска, склала пратакол затрыманьня і канфіскавала плякаты. За Беларускі сьцяг пасьпела падпісацца 39 асобаў, за лукашэнкаўска-савецкі — 11.

*14 траўня* на спэцыяльна скліканым брыфінгу пракурор **Іван Бранчэль**, які кіраваў рассьледваньнем справы аб зьнікненьні ***Дзімітрыя Завадзкага***, і намесьнік генэральнага пракурора **Міхаіл Сьнягір** назвалі вінаватых у зьнікненьні журналіста. Паводле іх высноваў, гэта справа злачыннай групоўкі, арганізаванай былым супрацоўнікам спэцпадразьдзяленьня „Альфа” **Валерыем Ігнатовічам**. (Прозьвішчы астатніх бандытаў названыя не былі з прычыны „таямніцы сьледзтва і прэзумпцыі невінаватасьці”.) Па словах пракурораў, Ігнатовіч адпомсьціў Завадзкаму за тое, што той назваў яго ў адным з газэтных інтэрв'ю. Журналістам гэтая вэрсія падалася вельмі хісткай, яны задалі пракурорам шмат пытаньняў, не на ўсе зь якіх атрымалі адказы. Справа Ігнатовіча патрапіць у суд не раней, як праз два месяцы, потым суд будзе пэўны час вызначаць пачатак працэсу. Выглядае, што разгляд справы пачнецца толькі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў.

*14 траўня* ў судзе Цэнтральнага раёну Менска адбыўся суд над сябрам барысаўскай арганізацыі Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) ***Алесем Барадулем***. Ён разам зь іншымі сябрамі партыі ***Зьміцерам Фядорчанкам, Сяржуком Падзолкам*** і сябрам *Маладой Грамады* ***Тацьцянай Ясюк*** 7 траўня пікетавалі будынак Менскага аблвыканкаму. Пікет прастаяў тры хвіліны, міліцыя груба пахапала іх. Кіраваў акцыяй „легендарны” намесьнік Цэнтральнага РУУС Барсукоў. Суддзя **Натальля Вайцяховіч** асудзіла *З. Фядорчанку* яшчэ 7 траўня на 20 мінімальных заробкаў. 14 траўня тая ж суддзя аштрафавала *А.Барадулю* таксама на 20 мін.заробкаў.

*Травень. У мястэчку Лунна Мастоўскага раёну Гарадзеншчыны* рашэньнем мясцовага сельсавету вуліца ***Элізы Ажэшкі*** перайменавана ў Камсамольскую. Ініцыятарам перайменаваньня былі мясцовыя камуністы. Ім удалося сабраць подпісы мясцовых савецкіх „вэтэранаў”, пасьля чаго ў Мастоўскі райвыканкам паслалі скаргу з патрабаваньнем вярнуць вуліцы „даўнюю” назву.

*15 траўня, Менск..* КГБ хоча запляміць маладыя душы. Студэнтку Беларускай Палітэхнічнай Акадэміі ***Кацярыну Бохан*** выклікалі ў службу бясьпекі Акадэміі (ёсьць такая!). Супрацоўнік КГБ (прадставіўся Генадзем Іванавічам, адказным за БПА) правёў зь ёю „размову” на працягу гадзіны. Пытаўся між іншым „про смысл жизни”, а таксама пра дзейнасьць Задзіночаньня Беларускіх Студэнтаў, запрашаў супрацоўнічаць. Кацярына адмовілася. Трэба зазначыць, што ў цывілізаваных краінах вярбоўка агентуры спэцслужбамі на тэрыторыі вучэбных установаў забароненая законам.

*15 траўня* ў абласное ўпраўленьне КГБ у Горадні выклікалі галоўнага рэдактара газэты *„Пагоня”* ***М.Маркевіча*** і карэспандэнта ***П.Мажэйку***. Яны „давалі тлумачэньні” наконт публікацыі *„Інтэграсты ў Горадню не прыедуць!” („Пагоня”, №19, 10 траўня 2001 г.)*. Кагэбістаў цікавіла агульная дзейнасьць рэдакцыі: працэс стварэньня газэты, крыніцы фінансаваньня, тэхнічнае абсталяваньне. Потым (24 траўня) у КГБ выклікалі карэктара газэты ***Сьвятлану Гібульскую,*** наборшчыцу ***Аксану Бурдзюк*** і бухгалтара ***Ніну Акудовіч***.

Па словах *М.Маркевіча,* распачатае фактычна запалохваньне супрацоўнікаў газэты, якое мае на мэце дэстабілізаваць працу выданьня і можа прывесьці да закрыцьця няўгоднай уладам газэты.

*Травень.* Жыхар Горадні ***Рыгор Фарманян*** зьвярнуўся з адкрытым лістом да пракурора вобласьці з патрабаваньнем вярнуць яму рукапіс

ягонага апавяданьня *„Лука і ў Арменіі — Лука”* ды іншыя рукапісы. Паводле словаў сп.Фарманяна, яны былі канфіскаваныя міліцыяй падчас вобыску ў ягонай кватэры 5 красавіка 1999 г. (падчас рэпрэсіяў уладаў супраць сяброў выбарчых камісіяў).На заявы аўтара пракуратура адказаў не давала.

*Травень. Расейскай „вязью” па беларускім календары*. Выдавецкі цэнтар БелТА нядаўна выпусьціў каляровы плякат-каляндар, прысьвечаны 885-м угодкам Слуцка. Тытул плякату выведзены вялікімі літарамі расейскай ламанай „вязі” — „885 лет со дня первого ўпоминанія Слуцка...” Быццам ужо горад — не старадаўняе апірышча беларускай нацыянальнай ідэі і культуры, а нейкі занядбаны куточак „Северо-Западного края”.

*16 траўня ў Менску* падчас пікету, прысьвечанага праблеме зьнікненьня грамадзкіх дзеячоў у Беларусі, каля будынку Міністэрства ўнутраных справаў былі затрыманыя ***Людзьміла Бажок***, ***Лявон Малахаў***, ***Лявон Садоўскі***. Затрыманыя былі дастаўленыя маёрам **А**.**Барсуковым** у РУУС Цэнтральнага раёну.

*16 траўня.* Пракуратура Рэспублікі Беларусь заявіла, што ня бачыць складу злачынства ў праграмах Нацыянальнага тэлебачаньня „Тайные пружины политики”, на што ўжо неаднойчы спрабавала зьвярнуць увагу Генэральнага пракурора сп. **Шэймана** *Таварыства Беларускай Мовы*. Сябры *ТБМ* у сваіх лістах даводзілі, што ледзьве ня ў кожным з выпускаў названае праграмы зьневажаецца беларуская мова і яе носьбіты.

*16 траўня* а 21-й гадзіне міліцыя напала на кватэру *намесьніка старшыні Беларускага Народнага Фронту* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Сяргея Папкова***. *Спадар Папкоў* уваходзіў у сваю кватэру разам з трыма сябрамі партыі, як раптам з чатырох міліцэйскіх машынаў у кватэру ўварваліся 15 міліцыянтаў. Яны заламвалі рукі сябрам партыі, скруцілі рукі *сп. Папкову*, парваўшы пры гэтым вопратку, і зьвезьлі яго ў невядомым напрамку. Ніякага ордэру або дакумантаў міліцыянты не прад’яўлялі. Потым, дзякуючы трывозе, якая была паднята сябрамі *Партыі БНФ*, высьветлілася, што *сп. Папкоў* тры гадзіны знаходзіўся ў РУУС Цэнтральнага раёну Менску. Вызваляць *сп. Папкова* паехалі сябры *Партыі БНФ* і журналісты.

Супраць спадара *Папкова* міліцыя спрабуе сфабрыкаваць абвінавачваньні за „арганізацыю несанкцыянаванага шэсьця 26 красавіка сёлета”. Суд над *С.Папковым* перанесены на 23 траўня.

Істэрычная, грубая рэакцыя ўладаў тлумачыцца страхам рэжыму перад пратэстам, які *Партыя БНФ* пляную арганізаваць 18 траўня на Цэнтральнай плошчы перад Палацам рэспублікі, дзе Лукашэнка зьбіраўся праводзіць свой „усебеларускі сход”, на якім плянаваў пацьвердзіць сваю пакорнасьць перад Расеяй.

*17 траўня* сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* сустракалі каля гатэляў сталіцы „дэлегатаў” псэўданароднага сходу і раздавалі ім тэксты Канстытуцыі Беларусі, нагадваючы аб адказнасьці за здраду дзяржаве. Падчас гэтай акцыі міліцыя затрымала і даставіла ў пастарунак удзельнікаў акцыі пратэсту: ***Валянціну Мароз***, ***Натальлю Клімовіч***, ***Анатоля Шуманскага***, ***Мікалая Галаўнёва***, ***Уладзімера Ладуцьку***. Іх пратрымалі ў пастарунку тры гадзіны, склалі пратаколы.

*17 траўня, Менск.* Каля ўваходу ў мэтро былі затрыманыя 4 чалавекі, якія трымалі расьцяжку: *„Не здамо Беларусь!”*. Да пікетоўцаў пад’ехалі дзьве машыны „Жыгулі”. Былі затрыманыя ***Віталь Новікаў Алесь Стральцоў Сяргей Рабкевіч***. *Алесь Стральцоў* пры арышце быў моцна зьбіты. У зьбіваньні прымалі ўдзел восем „цывільных”. Білі рукамі і нагамі па нырках. Затрыманых даставілі ў аддзел міліцыі Ленінскага раёну Менска, склалі на іх пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні.

*18 траўня* а 13-й гадзіне ў падземным пераходзе на станцыі мэтро „Кастрычніцкая” ў Менску асобамі у цывільным (якія брудна лаяліся) прэвэнтыўна былі затрыманыя ***Цімох Атрошчанкаў***, ***Яніна Санько***, ***Натальля Васілевіч***, ***Натальля Каргіна***, ***Алег Сагадзін***, ***Яўген Пармякоў***, ***Уладзімер Горса***. Усе затрыманыя нічога супрацьпраўнага не рабілі. На сваім адзеньні яны мелі значкі зь *Бел-Чырвона-Белымі нацыянальнымі сьцяжкамі. Цімоха Атрошчанкава* білі і выкручвалі рукі.

*18 траўня, Менск.* Дэманстратыўную акцыю ў абарону незалежнасьці Беларусі і Канстытуцыі, распачалі зранку *сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* і *Беларускага народнага Фронту „Адраджэньне”* перад Палацам рэспублікі, дзе пачынаўся лукашэнкаўскі „усебеларускі сход” („дэлегаты” якога былі прызначаныя і „абдараваныя” Лукашэнкам). Удзельнікі дэманстрацыі сьпявалі беларускія нацыянальны і духоўны гімны, уздымалі беларускія сьцягі, выстаўлялі плякаты і лёзунгі: *„Абаронім Беларусь!”, „НЕ — зьнішчэньню Беларусі!”, „Зянон Пазьняк — беларускі кандыдат!”* і інш.

Акцыю распачала а 9-й гадзіне група каля 50-ці асобаў. Праз нейкі час па загаду Міністра ўнутраных справаў **У**.**Навумава**, які ахоўваў Палац, пад’ехала некалькі аўтобусаў, зь іх выскачыла зграя невядомых у цывільным адзеньні і накінулася на фронтаўцаў. Людзей хапалі, зьбівалі, заштурхвалі і кідалі ў аўтобусы. Пры гэтым моцна пакалечылі некалькі чалавек. Спадару ***Уладзімеру Юхо*** паламалі правую руку ў двух месцах і зламалі рабро; спадару ***Міколу Анцыповічу*** моцна пашкодзілі і зьбілі нагу, са спадарыняй ***Сьвятланай Захарэвіч*** і прафэсарам ***Міколам Савіцкім*** здарыўся сардэчны прыступ. Пры гэтым генэрал Навумаў сам хапаў за рукі людзей, якіх зьбівала зграя.

Нараніцы схапілі больш ***20-ці*** чалавек. На працягу дня — яшчэ столькі ж. Сярод іх — ***Уладзімер Плотнікаў***, ***Пілін Рачыцкі***, ***Уладзімер Івашкевіч***, ужо ўспомнены тут ***Уладзімер Юхо*** ды ***Мікола Анцыповіч***, ***Алег Радзюк***, ***Віктар Кавэшнікаў***, ***Анатоль Лагутаў***, ***Уладзімер Раманцоў***, ***Валянціна Сучок***, ***Генадзь Пляшко***, ***Віктар Туравец***, ***Галіна Рабянкова***, ***Натальля Васілевіч***, ***Яўген Пазьнякоў***.

Пад вечар схапілі маладафронтаўцаў ***Алеся Панцялея***, ***Паўла Севярынца***, ***Алеся Тарасава***, ***Ягора Куніцу*** і ***Алеся Нішчына***, якія ладзілі прадстаўленьне на праспэкце Скарыны. Тут жа затрымалі ***В.Шчукіна***.

*У. Плотнікава, А. Радзюка, П. Рачыцкага, У. Івашкевіча* судзілі ў гэты ж дзень у Цэнтральным райсудзе. Прысудзілі штрафы: адным па 20, іншым — па 30 мінімальных заробкаў. Суды над рэштай арыштаваных адкладзеныя на потым.

*(**Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ і Прэс-служба БНФ.** Па матэрыялах Камісіі, СМІ (друку, радыё), „Вясны-96”, SANA)*

## У РЭЧЫЦЫ

Як і паўсюдна ў Беларусі, рэпрэсіі ў Рэчыцы супраць беларускай моладзі выконваюць і арганізуюць міліцыя, пракуратура і КГБ. Яны робяць гэта незаконнымі і крымінальнымі мэтадамі, характэрнымі для акупацыйнага рэжыму ў Беларусі.

13 чэрвеня быў зьбіты актывіст *Маладога Фронту* ***Антон Цярэнцьеў*** (ён вяртаўся дахаты вечарам і атрымаў удар ззаду па галаве мэталёвай трубой. Нападнікі рассеклі яму галаву і зьніклі.

Затым 14 чэрвеня быў затрыманы лідар мясцовага *Маладога Фронту* ***Зьміцер Цярэнцьеў***. Яго трымалі ў міліцыі дапазна, сканфіскавалі ўлёткі і налепкі.

Вечарам 15-га чэрвеня міліцыянты адсачылі групу маладафронтаўцаў, якія вярталіся са штаб-кватэры, і нематывавана раптоўна затрымалі іх на аўтобусным прыпынку. Кіраваў групай захопу сяржант **Данілкоў**. У шаснаццацігадовага ***Зьміцера Баркоўскага***, сямнаццацігадовага ***Мікалая Жмакіна*** і ***Зьміцера Цярэнцьева*** адабралі асабістыя рэчы, у якіх міліцыянты шукалі налепкі і ўлёткі.

Пасьля гэтага іх выклікалі на размову ў КГБ. Кагэбісты распытвалі іх пра арганізацыю акцыяў пратэсту. Калі хлопцы адмовіліся адказваць, ім сталі пагражаць выгнаньнем з вучобы. Адпусьцілі толькі ўначы.

***Р.С.***

# ВЕРА І ПАЛІТЫКА

Мы, беларусы, — хрысьціянскі народ. Гісторыя нашай веры драматычная. Мы перанялі ўсходняе Хрысьціянства ад Грэцыі цераз Балгарыю і Сербію. Аднак Беларусь не была Ўсходам і на працягу ўсёй гісторыі, ад часоў заснаваньня моцнай дзяржавы, — Вялікага Княства Літоўскага — змагалася з усходняй дэспотыяй, якая называлася спачатку Залатой Ардой, затым Маскоўшчынай, потым — Расеяй. (*„Мы на самым краі Хрысьціянства”,* — пісаў ***Мікола Гусоўскі***.) У барацьбе з Усходам і ў змаганьні з Расеяй — увесь зьмест нашай тысячагадовай гісторыі.

Тут канфлікт цывілізацыяў, і Беларусь — на падзельнай мяжы. Гэта не магло не ўплываць на нашу веру. Усходняя імпэрыя, што ваявала супраць нас, таксама пераняла Хрысьціянства з Усходу і, узмацніўшыся, пачала выкарыстоўваць рэлігійную ідэнтычнасьць у сваіх палітычных інтарэсах.

Гэта спрыяла таму, што найбольш актыўныя беларускія вярхі, змагаючыся з Масквой, зьмянялі ўсходні абрад на заходні, адсякаючы маніпуляцыі ўсходняга непрыяцеля. Але гэта не палепшыла становішча.

У XVI стагоддзі, у часы распаўсюджаньня пратэстанцызму ў Эўропе, частка беларускай арыстакратыі прыняла пратэстанцтва і паспрабавала кансалідаваць народ на падставе моднага тады кальвінізму. З гэтага нічога не атрымалася. Беларускае грамадзтва рабілася ўсё больш шматканфэсійным і індэферэнтным.

Аднак у самым канцы XVI стагоддзя ўдалося ажыцьцявіць вялікую кансалідацыйную ідэю: заключыць Царкоўную Вунію паміж Усходнім і Заходнім Хрысьціянствам на Беларусі.

Цяпер, гледзячы здалёку, трэба прызнаць, што гэта была найвялікшая падзея ў беларускай гісторыі. Праз няпоўныя 200 гадоў Вунія, культурна і духоўна, скансалідавала беларускае грамадзтва і заклала падваліны пад будучыню беларускай нацыі, найглыбейшым чынам паўплывала на беларускае сакральнае мастацтва, вобразную творчасьць і сьведамасьць беларусаў. Вунія дала ў рукі беларусам пастаянны і натуральны абаронны шчыт перад разбуральнай і рэлігійнай па форме агрэсіяй усходняй імпэрыі.

У канцы XVIII стагоддзя, перад разборамі *Рэчы Паспалітай*, беларускае хрысьціянскае насельніцтва складалася з 80 адсоткаў вуніятаў, 5-ці адсоткаў праваслаўных і 15-ці адсоткаў каталікоў.

У першай палове XIX стагоддзя расейцы, захапіўшы Беларусь, расправіліся з *Вуніяй*. Было забіта і замардавана тысячы беларусаў, вуніяцкіх сьвятароў і вернікаў, спаленыя тысячы беларускіх кніг, абразоў, твораў мастацтва, пазачыняныя і разбураныя вуніяцкія школы, кляштары і сьвятыні, зачынены Віленскі ўнівэрсітэт. Генацыд беларусаў ажыцьцяўлялі спэцыяльныя расейскія карныя атрады з казакаў. Падзеі зьдзеку над беларускім насельніцтвам, людабойства і вымардаваньне веры апісаныя часткова ў *„Актах пакутніцкай Вуніі”*, выдадзеных яшчэ ў XIX стагоддзі на польскай мове. Аднак самы беларусы гісторыі гэтага страшнага вынішчэньня яшчэ не напісалі.

* * *

У сярэднявеччы, за часы існаваньня феадальных дзяржаваў, веравызнаньне мела вялікае значэньне для кансалідацыі грамадзтва. Новы час прынёс новыя, ужо не рэлігійныя, а нацыянальныя ідэі кансалідацыі і запатрабаваў новую форму дзяржаўнасьці, заснаванай не на феадальным праве і ўласнасьці, а на волі нацыі.

Аб’яднаўчым, сьведамым ідэйным чыньнікам нацыянальнага грамадзтва зьяўляецца ўжо не рэлігія, як раней, а нацыянальная культура і, перш за ўсё, — нацыянальная мова, нацыянальная літаратура і нацыянальны тэатр.

Пытаньне канфэсійнасьці на Беларусі перастала быць прыярытэтным. Да стварэньня сваёй новай нацыянальнай дзяржавы ў пачатку 1918 года, беларускае грамадзтва прыйшло шматканфэсійным. Шматканфэсійнасьць паглыбілася ў XIX-XX стагоддзях, перш за ўсё, з прычыны палітычных дзеяньняў непрыяцеля ў Беларусі. Аднак гэта ўжо не зьмяніла і не аслабіла культурнага адзінства беларускага народу (як таго спадзяваліся з Усходу і Захаду).

На сёньняшні дзень беларускае грамадзтва складаецца з чатырох, прыкладна роўных групаў людзей, якія так ці інакш згуртаваныя альбо зьвязаныя з каталіцкім ды вуніяцкім касьцёлам, праваслаўнай (артадаксальнай) царквой, пратэстанцкімі абшчынамі і сьвецкім атэізмам (бязбожніцтвам). Апошняя група не зьяўляецца канфэсіяй. Але яна ў рэальнасьці, бадай, ці не найбольшая, хоць адкрыта сябе не выяўляе і прыстасоўваецца да абставінаў. (Камунізм не мінае бясьследна.)

* * *

У другой палове 80-х гадоў мінулага стагоддзя, калі на Беларусі аднавіўся рух беларускага Адраджэньня, тады былі адроджаныя і прынцыпы нацыянальнай кансалідацыі грамадзтва, разбураныя рускімі камуністычнымі каланізатарамі.

Галоўнымі фактарамі адраджэнскай кансалідацыі грамадзтва ў барацьбе за свабоду былі беларуская мова і культура, сацыяльная справядлівасьць, эканамічная ўласнасьць і незалежная Беларуская дзяржава.

Адначасна *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”* сфармуляваў палітычныя дачыненьні да рэлігіі і канфэсійных групаў насельніцтва. *Фронт* прызнае свабоду сумленьня і паважае рэлігійныя традыцыі беларускага народу. За агульны кансалідацыйны чыньнік нацыі бярэцца беларуская культура, беларуская мова і беларускія інтарэсы, рэалізаваныя ў Беларускай нацыянальнай дзяржаве. З гэтага гледзішча, беларускія адраджэнцы раўназначна станоўча адносяцца да ўсіх беларускіх хрысьціянскіх канфэсіяў і да нехрысьціянскіх канфэсійных меншыняў, прызнаюць свабоду сумленьня, у тым ліку, і права на невызнаньне ніякай рэлігіі (але гэта не ўхваляецца). Беларуская дзяржава, якой будуць кіраваць беларусы-адраджэнцы, ня стане перасьледваць атэістаў, але дзяржаўная палітыка мусіць быць скіраваная на стварэньне ўмоваў, для разьвіцьця каштоўнасьцяў Хрысьціянства, высокага ўзроўню грамадзкай маралі і маральнай асобы чалавека.

Акупацыйныя ўлады на Беларусі, якога б ідэалягічнага кшталту яны ні былі, заўсёды аддавалі прыярытэт той канфэсіі, якая зьяўлялася пераважнай у іхняй краіне. Яны стараліся, перш за ўсё, падпарадкаваць беларускія канфэсіі пад іерархію акупацыйнай дзяржавы. Нават рускія бальшавікі-бязбожнікі, зьнішчаючы ўсё рэлігійнае, тым ня менш апасродкавым чынам аддавалі перавагу праваслаўнай царкве. (Асабліва ў апошнія часы існаваньня СССР.)

Немалаважнае значэньне ў растлумачэньні такога дзіўнага, на першы погляд, прыярытэту бальшавікоў, мела „кагэбізацыя” рускай праваслаўнай царквы. У 1929 годзе, пры Патрыярху Сергію, бальшавікі зламалі супраціўленьне праваслаўнага кіраўніцтва, і рускае кіруючае праваслаўе (нясучы адначасна страты ў людзях і ў веры) пайшло на супрацоўніцтва з камуністамі і НКВД. Чэкісты напрасткі засылалі свае кадры ў духоўныя сэмінарыі і акадэміі, у структуры праваслаўя і, пры спрыяньні патрыярхаў, хутка кагэбізавалі іерархію рускай праваслаўнай царквы, ператварыўшы яе ў своеасаблівы аддзел КГБ.

Тут зазначу, што руская праваслаўная царква была падпарадкаваная дзяржаве і страціла самастойнасьць яшчэ ў пачатку XVIII стагоддзя, пры цары Пятры-шалёным (як называлі яго беларусы).

У XIX стагоддзі праваслаўная царква ўжо ў значнай ступені зьвязаная з паліцыяй і ператварылася ў выпрабаваную зброю рускага самадзяржаўя, каляніяльнага ўціску і імпэрскай экспансіі.

Пасьля распаду СССР і савецкай сістэмы сацыялізму, палітычная ўлада вышэйшага праваслаўнага клеру павялічылася. Кагэбізаванае праваслаўе стала імітаваць дзяржаўную ідэалёгію кагэбізаванай Расеі. На праваслаўныя сьвяты кіраўнікі Крамлю (былыя бязбожнікі і энкавэдзісты) выстройваюцца ля алтара са сьвечкамі ў правай руцэ. Патрыярх Маскоўскі **Алексій II** (ён жа генерал КГБ **Рыдзігер**, агентурная клічка **„Дроздов”**) неаднаразова „благословляет” генацыд у Чачэніі і вынішчэньне чачэнцаў,

ухваляе вайну, узнагароджвае бязбожніка Лукашэнку праваслаўным ордэнам, выступае ініцыятарам і праводзіць кананізацыю (прылучэньне да абліччa сьвятых) *аднаго з найбольшых злачынцаў ХХ-га стагоддзя — рускага цара Мікалая ІІ („крывавага”).* *

* * *

Пасьля заняцьця Беларусі савецкім войскам ў 1944 годзе, ізноў была адноўленая ўлада маскоўскага патрыярхату над праваслаўнымі беларусамі.

Але беларусы бачылі, што такое маскоўская царква. Як і ў ранейшыя часы, адбываўся адплыў да пратэстантызму, хоць пратэстанцкія абшчыны за саветамі надзвычай жорстка перасьледвалі. (Вернікаў не ўладкоўвалі на працу, выдумвалі штучныя абвінавачваньні, судзілі ды ссылалі, зьдзекваліся над дзецьмі, вялі шалёную прапаганду, прыдумвалі дзікія небыліцы, распальвалі нянавісьць да пратэстантаў і г.д.)

Прычыны такіх асабліва жорсткіх адносінаў бальшавікоў да пратэстантаў былі палітычныя. Гэтыя вернікі выпадалі з-пад кантролю КГБ. Каталіцкі касьцёл бальшавікі прыгаварылі на фізічнае выміраньне, перакрыўшы ўзнаўленьне кадраў сьвятароў. (Стары ксёндз паміраў і касьцёл зачыняўся. Парафія зьнікала.) Праваслаўе кагэбісты кантралявалі поўнасьцю праз свае кадры і сэмінарыі, а вось з пратэстанцтвам нічога не атрымлівалася.

Інфільтраваць яго агентурай было значна цяжэй. Пратэстанцкія абшчыны складаліся ў асноўным з простых беларусаў, на якіх бальшавік, акрамя страху, практычна ня меў ніякага ўплыву.

Такая ж сітуацыя засталася і цяпер, у час аднаўленьня на Беларусі расейскага нэакаляніялізму. Рэжым Лукашэнкі зразумеў, што паставіць сабе на службу беларускіх пратэстантаў (ці хоць бы часткова нэўтралізаваць, як каталіцкі касьцёл) яму ня ўдасца. Таму рэакцыя супраць пратэстантаў грубая і тыпова кагэбоўская: дыскрэдытацыя, пагрозы, паклёп і т.п. Імкнуцца запалохаць вернікаў.

Аднак за ўсім гэтым стаіць „стратэгічная” задача расейскага гэбізму: выклікаць у Беларусі нянавісьць па канфэсійнай прыкмеце, справакаваць канфлікты на рэлігійнай глебе і потым „камандаваць парадам” — лавіць рыбу ў мутнай вадзе.

200 гадоў працуюць рускія спэцслужбы над гэтай мэтай у Беларусі. Што толькі ні прыдумвалі: і „чорныя сотні”, і каталажкі, але так нічога і не атрымалася. І не атрымаецца. Я гэта кажу ўпэўнена, бо ведаю беларусаў.

* * *

Калі мы гаворым пра беларускае хрысьціянства, беларускае праваслаўе, беларускае каталіцтва ці беларускае вуніяцтва, то мы, вядома ж, разумеем, што Хрысьціянства ёсьць адзіным, і мы ня маем на ўвазе нейкую яго выключнасьць у Беларусі ці выпаданьне з агульнай сусьветнай дарогі Веры. „Беларускае” абазначае тое, што ня мусяць беларускімі вернікамі і грамадзянамі Беларусі кіраваць з замежных цэнтраў патрыярхі-гэбісты чужой дзяржавы і лейтэнанты ў сутанах. Гэта супярэчыць нашым нацыянальным інтарэсам.

Павінна быць так, як у вольных людзей, як у іншых вольных краінах Эўропы і як некалі ў нас было. Беларускай царквой павінны кіраваць беларускія першаерархі, кардыналы і біскупы. Хопіць акупацыі.

Аддзяленьне царквы ад дзяржавы абазначае, што царква не зьяўляецца дзяржаўным інстытутам улады і не выконвае функцыяў дзяржаўнай улады. Юрыдычна яна знаходзіцца на правах грамадзкай арганізацыі і падлягае ўсім дзяржаўным законам.

Царква ня мае такога юрыдычнага статусу, каб займацца кантрабандай, гандляваць цыгарэтамі ды гарэлкай, вывешваць сьцягі чужых дзяржаваў у алтарах і кіравацца антыбеларускай справай. Могуць быць прынятыя спэцыяльныя законы па канфэсіях, але яны павінны адпавядаць Канстытуцыі краіны.

* * *

Калі зазірнуць далей у будучыню вольнай Беларусі, у той час, калі мы адновім наш Беларускі дом і наш Беларускі Храм, калі будзем мець Беларускі нацыянальны ўрад, Беларускае кіраўніцтва і Беларускі друк, калі мы вернем дзяржаўнасьць Беларускай мовы і станем, нарэшце, сапраўднымі гаспадарамі ў сваёй краіне, то будучыня Беларускага Хрысьціянства ўяўляецца мне вельмі добрай. Зарукай таму зьяўляецца памяркоўнасьць і разумнасьць нашых людзей. Беларус ня любіць варагаваць з суседамі і з усімі імкнецца жыць мірна.

Распаўсюджаная зьява на Беларусі, калі ў адным мястэчку, дзе людзі ведаюць адзін аднаго, стаіць касьцёл, царква і частка жыхароў — пратэстанты. Аднак няма канфліктаў. Усё функцыянуе нармальна, людзі супрацоўнічаюць, працуюць, жэняцца і выходзяць замуж у межах насельніцтва, а не канфэсіяў.

Такія дачыненьні выпрацаваныя стагоддзямі і зьяўляюцца асаблівасцю беларусаў. Палітыканы чужых дзяржаваў увесь час хацелі ўшчыміцца ў гэтыя асаблівыя людзкія дачыненьні беларускага грамадзтва і навесьці свае парадкі. Безумоўна, што яны нарабілі шкоды, але, у прынцыпе, нічога не дамагліся. І не дамогуцца. Жыцьцёвая сіла людзкага адзінства беларусаў мацнейшая за наносную нянавісьць палітычных маніпулятараў.

Я лічу, што мы, беларусы, павінны вельмі шанаваць і мацаваць нашую людзкую памяркоўнасьць у канфэсійных дачыненьнях паміж сабой. Бо гэтая добрая рыса ёсьць псіхалягічнай асновай нашага культурна-нацыянальнага адзінства. А ўвогуле, калі падумаць глыбей, гэта ёсьць рыса духоўнай велічы беларусаў, падстава да сапраўднай дэмакратыі, моцы і вышыні будучай вольнай беларускай дзяржавы. Гэтая веліч Беларусі сапраўды будзе, бо яна ўжо сапраўды была і пакінула нам праз вякі найвялікшае багацьце — здольны, працавіты, памяркоўны і мірны народ.

*21 траўня 20001 г.* ***Зянон ПАЗЬНЯК***

---

* Нагадаю, што рускі цар-алькаголік Мікалай ІІ асабіста аддаў загад расстраляць 9-га студзеня 1905 года мірнае шэсьце людзей, якіх з іконамі і царкоўнымі харугвамі прывёў да царскай рэзыдэнцыі ў Пецярбургу праваслаўны поп-правакатар Гапон. Было забіта 1118 чалавек. У гісторыі гэтая трагічная падзея вядомая пад назвай „крывавая нядзеля”. Цара Мікалая ІІ, пасьля гэтага расстрэлу, назвалі „крывавым”.

Ніколі не было ні скрухі, ні пакаяньня ў гэтага чарговага страшнага і апошняга рускага цара. І тое, што бальшавікі па-бандыцку без суда расстралялі яго разам з сям’ёй, выглядае як Боская кара забойцу сотняў людзей. Тут усё сімвалічна, нават, што суда не было. Бо такіх чакае Боскі Суд. (Я ўжо не ўспамінаю тут пра жонку цара ды Распуціна, ды пра ўвесь гэты вядомы ў гісторыі бруд.)

Праз 80 гадоў нашчадкі камісараў у сутанах аб’яўляюць „сьвятым” забойцу нявінных людзей.

## У ГЛЫБОКІМ

У Глыбокім, як нам падалося, ідзе неабвешчанае змаганьне беларушчыны і расейшчыны, што адлюстравалася і на шыльдах з назовамі вуліцаў. На адных дамох яны стандартныя, з надпісам па-расейску; на іншых — выразаныя на драўляных дошчачках, пад даўніну, і па-беларуску. Людзі замаўляюць гэтыя шыльды на гарадзкім кірмашы ў майстраў.

***(З радыё. У. Ракіцкі)***

## ПРЭС-РЭЛІЗ

*(па матэрыялах „Народнай Волі”, „Пагоні”, „Нашай Свабоды”, SANA; травень-чэрвень 2001 г.)*

■ Цэны ўпарта растуць. Паводле дадзеных Міністэрства статыстыкі, за першыя два тыдні траўня рост спажывецкіх цэнаў у Беларусі склаў 1,3%. Усяго з пачатку году спажывецкія цэны павялічыліся на 18,3%.

■ У Беларусі — пэрспэктыва Туркмэністану. Туркмэнскі амбасадар у Менску Ільля Вэльджанаў выказаў задавальненьне вынікамі „народнага сходу” 18 траўня: „У Туркмэністане такія мерапрыемствы праводзяцца

штогод з першага году ўтварэньня нашай дзяржавы. Так быў прыняты канстытуцыйны закон, паводле якога для першага нашага прэзыдэнта Сапармурада Ніязава тэрмін паўнамоцтваў на гэтай пасадзе не абмежаваны". Карысны досьвед падданых туркмэнскага Сарданапала сапраўды служыць пуцяводнай зоркай Лукашэнку.

■ Беларускі турызм хутчэй мёртвы, чымсьці жывы. У 2000 г. толькі 60 тысячаў замежных турыстаў наведалі нашу краіну. Які немец пагодзіцца жыць у Бярэзінскім запаведніку за 72 даляры за суткі ці ў гатэлі „Юбілейным" за 32 даляры, калі катэдж пад Прагай яму абыдзецца ў суткі ня больш як 20 даляраў. Толькі аматараў экзатычнага баўленьня часу з Эўропы прывабяць Браслаўскія азёры, уздоўж якіх неабсталяваныя пляжы, у гатэлях няма гарачай вады, увечары — асьвятленьня на вуліцах, забаўляльнай інфраструктуры і крамаў. Ва ўсёй краіне няма пяцізоркавага гатэлю. Ва ўсіх культурніцкіх ды адпачынкавых установах існуюць тры віды коштаў, якія залежаць ад паходжаньня наведвальніка — так званы дзяржаўны рэкет супраць замежнікаў, які ўрад пакуль і не зьбіраецца адмяняць. Увогуле, вялікія кошты і адсутнасьць сэрвісу ўжо сталі нэгатыўнай візытоўкай турыстычнай Беларусі. Ня дзіва, што нікому не патрэбныя нашы ваўчэры для прыёму замежных турыстаў, кошты на іх упалі ўдвая, і турыстычны канцэрн"Белінтурыст" за 2 гады панёс страты ў 8 тысячаў даляраў, рэалізаваўшы толькі палову ваўчэраў.

■ На лукашэнкаўскім „народным сходзе" 18 траўня ў Менску выступіў і дэпутат Сэйму Польшчы **Ян Сычэўскі**. Ён выхваляў рэжым у Беларусі, „які не дазваляе раскрадаць народнае багацьце". Беларус зь Беласточчыны, ветэран-камуніст, Сычэўскі патрапіў у польскі Сэйм па выбарчым сьпісе Саюзу Левай Дэмакратыі (спадчыньнікі камуны).

Выдатны беларускі пісьменьнік ***Сакрат Яновіч*** заявіў у „Газэце Выборчай", што „Сычэўскі павінен разумець, каму на руку ў Менску такія прамовы польскага парлямантара, тым больш, дэпутата-беларуса, які ня можа ня ведаць пра палітыку кіраўніцтва Беларусі, якое імкнецца да поўнай русіфікацыі краіны і пераўтварэньня яе ў расейскую правінцыю".

■ Прэм'ер **Уладзімер Ярмошын** сустрэўся з латвійскімі парлямантарыямі ў Менску 22 траўня. Вось як адрэагаваў на гэтую сустрэчу намесьнік старшыні Сойму Латвіі ***Рамуальдас Разукс***: „Латвійскім дэпутатам варта ўстрымацца ад паездак у Беларусь, і тым больш — ад сустрэчаў з афіцыйнымі прадстаўнікамі Менску, папярэдне не атрымаўшы санкцыю Сойму. Сітуацыя з дэмакратыяй і правамі чалавека ў гэтай краіне неспрыяльная". Сп. Разукс адзначыў, што некалькі дэпутатаў Сойму Латвіі, якія зараз знаходзяцца ў Беларусі, ніяк не зьяўляюцца прадстаўнікамі латвійскага парляманту, а прыватнымі візіцёрамі.

■ У нашай краіне большасьці народу немагчыма ня толькі годна жыць, але і правесьці ў апошні шлях нябожчыка. У Паставах, калі летась арганізоўвалі пахаваньне старшыні райвыканкаму В.Чэпіка, труну дастаўлялі зь Летувы. Па кветкі і па вянкі пасылалі ганцоў у ньблізкі сьвет. Па іроніі лёсу кіраўнік „вертыкалі" пры жыцьці кпіў з вопыту рынкавых рэформаў у летувісаў.

■ 150 тысячам настаўнікаў затрымліваюць заробкі за некалькі апошніх месяцаў. Агульная сума складае 3 мільярды рублёў. Найгоршая сітуацыя склалася на Магілёўшчыне, на якую прыпадае 90% ад усёй запазычанасьці перад педагогамі.

■ Сябры праўленьня ды іншыя мэнэджэры расейскага ААТ „Газпрам" сістэматычна пераводзяць актывы на сваіх сваякоў і сяброў. Да такой высновы прыйшла пасьля свайго рассьледваньня нямецкая газэта „Франкфуртэр Рундшаў". Тацьцяна, дачка старшыні праўленьня „Газпраму" Рэма Вяхірава, Алена, дачка першага намесьніка старшыні праўленьня Вячаслава Шарамета і Віталь Чарнамырдзін (сын былога расейскага прэм'ера) у лістападзе 1998 г., разам зь іншымі сваякамі мэнэджмэнту набылі маскоўскую фірму „Харват" за 40 рублёў 50 капеек (!). А „Харват" кантралюе праз сваю даччыную структуру „Інтэрпракам" 10% будапэшцкай кампаніі „Панрусгаз", якая ёсьць расейска-венгерскім сумесным прадпрыемствам і будзе імпартаваць у Венгрыю газ. Згаданыя дочкі кіраўнікоў „Газпраму" і Віталь Чарнамырдзін набылі таксама зь іншымі набліжанымі асобамі кампанію „Інтэргазкамплект" за 940 марак (428 даляраў!), якая пастаўляе абсталяваньне „Газпраму".

■ Паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, у першым квартале сёлета стратнымі былі 33,6% прадпрыемстваў, тады як у студзені-сакавіку 2000 г. — 29,2%. Больш за ўсё стратных прадпрыемстваў у прамысловасьці будматэрыялаў — 51,7%, лёгкай прамысловасьці — 48,2%, паліўнай — 42,5%, харчовай — 34,9%.

■ У траўні ў Грузіі загінуў кантрактнік памежных войскаў Расеі беларус *Васіль Чычэвіч*, ураджэнец вёскі Прылукі Берасьцейскага раёну. На радзіме 23-гадовага капітана атрымалі трагічную вестку зь мясцовага ваенкамату. Бацька легіянера поўнасьцю пасівеў, а 28 траўня вымушаны быў паехаць у Маскву. З Расеі яму нават не патэлефанавалі, і ёсьць чуткі, што сын ўжо пахаваны недзе на вайсковых могілках.

■ Найменшы рост прамысловай вытворчасьці ў 2001 г. сярод дзяржаваў СНД зафіксаваны ў Беларусі. Паводле зьвестак статыстычнага камітэту СНД, за першы квартал сёлета рост прамысловай вытворчасьці склаў у Беларусі 2,2%. У Расеі — 3,3%, у Казахстане — 11%, на Ўкраіне — 17%.

■ Дэфіцыт кадраў ва ўстановах аховы здароўя ў Менску складае ад 22% да 40%. Укамплектаванасьць лекарамі — 75%, сярэднім медпэрсаналам — 78%, малодшым — 60%. Асноўная прычына — нізкі заробак.

■ Начальнік аддзелу па эканамічнай бясьпецы Упраўленьня КГБ па Магілёўскай вобласьці Ў.Гатоўчык зьвярнуўся да кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў рэгіёну па „супрацоўніцтва". Цяпер за трое сутак да візіту замежнікаў на прадпрыемства трэба інфармаваць пра гэта КГБ. Ловяць шпіёнаў!

■ За апошнія 5 гадоў у Беларусі на 17% узрасла колькасьць сардэчна-сасудзістых захворваньняў. На іх цяпер пакутуе 2,5 мільёна беларусаў. Сярод усіх хваробаў яны займаюць першае месца (як прычына сьмерці) — 53% сьмерцяў. Беларусь разам зь іншымі краінамі СНД уваходзіць у групу краінаў з найбольш неспрыяльнай кардыялягічнай сітуацыяй.

■ **„Парадваў"** беларусаў сваім паседжаньнем у Вільні 29 траўня камітэт па грамадзянскім вымярэньні бясьпекі ў рамках сэсіі Парляманцкай асамблеі НАТО, дзе разглядалася „Беларускае пытаньне". А.Лябедзька і М.Грыб (якіх ужо раней не пусьцілі ў венскае крэсла беларускай дэлегацыі ў Вене, а перасадзілі на зэдлікі на галёрцы) ня былі нават запрошаныя на віленскі форум як „выдатныя барацьбіты за Беларусь". Замест іх у Вільню запрасілі яшчэ больш бліскучых „палітыкаў-барацьбітоў": А.Фядуту(!), В.Палевікову (старшыню жаночай партыі „Надзея") і С.Багданкевіча (ганаровага (!) старшыню АГП). Парадыйна-камічны характар мелі і пэўныя фрагмэнты афіцыйнага дакладу, прадстаўленага дэлегацыяй камітэту ПА НАТО, якая наведала Беларусь у сакавіку. Вось напрыклад: „Наяўнасьць передвыбарчай камбінацыі з чатырох лідэраў — гэта найлепшая кааліцыя для забесьпячэньня шырокай падтрымкі насельніцтва". Можна было б пасьмяяцца з гэтага маразму, каб не сур'ёзнасьць самой тэмы.

